ПРЫНЦ ТОЛЬКІ ПА ТОЙ БОК МАНІТОРА

Сямейная газета

ПАДАРОЖЖА ПА БЫКАЎСКІХ МЯСЦІНАХ

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 113 (29993)

КАРАТКА

- Другі энергаблок БелАЭС уключаны ў сетку.
- **Нацбанк: склад звестак, якія ўключаюцца ў крэдытную справаздачу, будзе залежаць ад мэты яго атрымання.**
- У Беларусі плануюць аднавіць каля 400 тысяч гектараў парушаных тарфянікаў.
- **ВТБ (Беларусь) пачаў выдаваць крэдытныя карткі рамеснікам.**
- Улетку ў Беларусі будзе працаваць каля 6 тысяч дзіцячых лагераў.
- **У Беларусі доля рублёвай састаўляючай у сярэдняй шырокай грашовай масе ўзрасла да 52,9 працэнта.**
- У краіне праводзіцца імунізацыя дзікіх жывёл для прафілактыкі шаленства.
- **Больш за Br10 млн выдзелілі з бюджэту Брэсцкай вобласці на рамонт ФАПаў і амбулаторый.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НІКОЛІ НЕЛЬГА, ГАВОРАЧЫ АБ «ЧЫРВОНЫХ ЛІНІЯХ», ІХ МАЛЯВАЦЬ»

Аб чым гаварыў Прэзідэнт Беларусі ў інтэрв'ю тэлеканалу «Расія-1»

Пасля наведвання аднаго з прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу ў Мінскай вобласці Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю тэлеканалу «Расія-1». У якасці інтэрв'юера выступіла тэлевядучая Вольга Скабеева.

Фота БелТА.

АБ РОЛІ БЕЛАРУСІ Ў СВА

У першую чаргу Вольга Скабеева падзялілася сваімі ўражаннямі ад наведвання беларускай граніцы, дзе размешчаны зенітна-ракетныя комплексы С-400.

«Мы ўчора былі на граніцы. Нам усё паказалі. Мы прыйшлі да высновы, што граніца на замку і вораг не пройдзе дакладна», — адзначыла тэлевядучая. «Абсалютна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заявіў, што Беларусь і Расія выконваюць усе дамоўленасці ў вайсковай сферы. «Калісьці даўно-даўно (калі мы з Пуціным неяк спрачаліся — газ, нафта, малочныя войны) я сказаў, што не трэба нам адзін супраць аднаго ваяваць. Прыйдзе час, калі спіна к спіне будзем стаяць і адстрэльвацца. Твае калегі, асабліва ў Расіі: «Хі-хі, ха-ха. Як адстрэльвацца?» А сёння? А сёння адстрэльваемся, стоячы спіна к спіне», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Іспыты ў дарослае жыццё

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартавала ў Беларусі

Ангеліна ЛАЎРЫНОВІЧ прыйшла здаваць ЦТ па беларускай мове ў БДПУ імя Максіма Танка. Дзяўчына скончыла Магілёўскі дзяржаўны медыцынскі каледж і ўжо год працуе фармацэўтам. Акрамя таго, яна ўваходзіць у Рэспубліканскі маладзёжны савет пры Міністэрстве аховы здароўя. Да ЦТ Ангеліна рыхтавалася старанна: хоча паступіць на завочнае аддзяленне ВНУ.

Здача цэнтралізаванага тэсціравання пачалася 14 чэрвеня па ўсёй краіне з іспыту па беларускай мове.

Паколькі сёлета ўпершыню прайшоў цэнтралізаваны экзамен, колькасць тых, хто зарэгістраваўся на тэсціраванне, стала значна меншай. Аб гэтым расказаў **Віктар БУРЛО, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення кантролю бюджэтна-фінансавай сферы Камітэта дзяржаўнага кантролю.** Напрыклад, калі беларускую мову летась здавала каля 18 тысяч, то сёлета на ЦТ зарэгістраваўся 3031 абітурыент.

Таксама ён дадаў, што механізм правядзення ЦТ такі ж, як і ў папярэднія гады. Адрозненне толькі ў тым, што супрацоўнікі КДК здзяйсняюць кантроль выязнымі групамі, якія працуюць у кожным пункце правядзення ЦТ.

Сёння па краіне такіх пунктаў 37. Адзін з іх у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. **Сяргей ВАСІЛЕЦ, прарэктар па вучэбнай рабоце БДПУ,** заявіў, што на здачу ЦТ па беларускай мове ў іх універсітэце зарэгістравалася 210 чалавек. Тэсціраванне праходзіла ў пяці аўдыторыях галоўнага корпуса. За ўвесь час кампаніі яны чакаюць звыш 3200 абітурыентаў на праходжанне ЦТ па тых прадметах, якія замацаваны за гэтай ВНУ.

— Адчуваецца, што ЦЭ, новаўвядзенне бягучага года, адцягнуў на сябе значную частку абітурыентаў, і лічбы ні ў якое параўнанне не ідуць з той колькасцю абітурыентаў, якія прыходзілі на ЦТ у ранейшыя гады. Прыходзяць выпускнікі мінулых гадоў, выпускнікі каледжаў, прафтэхвучылішчаў, іх менш, — дадае Сяргей Васілец. — Ну а ў цэлым усё праходзіць дастаткова стандартна, мы па такой схеме працуем больш за 15 гадоў.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Глеб ЛАПІЦКІ, дырэктар «Славянскага базару»:

«Фестываль не толькі ўзбуйняецца, але і стаіць на сваім, незалежна ад палітычных павеваў. Самае важнае, што фестываль па-за ўсім гэтым. У нас ёсць выдатны слоган: «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». Так называецца прэмія кіраўніка дзяржавы, якая ўручаецца штогод. Мы рады бачыць на «Славянскім базары» ўсіх, хто падзяляе з намі гэты слоган. Васільку (сімвалу нашага фестывалю) немагчыма забараніць расці ў якой-небудзь краіне. І сёлета мы чакаем на фестывалі прадстаўнікоў каля трох дзясяткаў краін».

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«НІКОЛІ НЕЛЬГА, ГАВОРАЧЫ АБ «ЧЫРВОНЫХ ЛІНІЯХ», ІХ МАЛЯВАЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гаворачы аб расійскай спецыяльнай ваеннай аперацыі, Прэзідэнт звярнуў увагу, што кіраўніцтва Расіі, у тым ліку Уладзімір Пуцін, ніколі не прасілі Беларусь далучыцца да баявых дзеянняў. «Таму што гэта намнога горш было б», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. Разам з тым Аляксандр Лукашэнка адразу заявіў: беларусы не дазволяць страляць у спіну расіянам. «Гэта наша роля ў гэтай вайне», — нагадаў ён.

Вольга Скабеева, у сваю чаргу, заўважыла: «Розныя былі часы. Але ў нас у Расіі ўсе бясконца вам удзячныя. Іншы раз складваецца адчуванне, што Расія адна супраць не проста блока НАТА — 51 дзяржава дапамагае Украіне. І вось ёсць такі брат, сябар, таварыш — гэта, вядома, дарагога варта».

«Тут няма нічога незвычайнага. Мы маем з Расійскай Федэрацыяй дамову, паводле якой у нас фактычна адзіная армія. Мы лаяліся, біліся па ўсіх напрамках, але ўзброеныя сілы захавалі адзінства. І ўсё, што прапісана планам (а план не сакрэтны, мы Захаду пра гэта гаварылі), мы выконвалі і выконваем», — падкрэсліў Прэзідэнт.

ЧАГО БАІЦЦА ЗАХАД?

«У нас з Польшчай, Латвіяй, Літвой граніца 2,5 тысячы кіламетраў. Яе трэба закрыць. Хто сёння гарантуе, што ў нас няма адтуль пагрозы? Аказваецца, ёсць. Ачумелыя натаўцы праводзяць вучэнні. Нас папракаюць, што мы ядзерную зброю пад нараду НАТА ў Вільні падцягваем, а яны вучэнні праводзяць — дзясяткі тысяч чалавек удзельнічаюць з усяго блока НАТА. Таму той кірунак вельмі небяспечны. Я не прарок, але ва Украіне мы скончым гэтую вайну. Да гэтага ўжо вялікія перадумовы. Але далей нам гэтыя ачмурэлыя з Захаду занадта шмат праблем створаць. І калі толькі яны гэтыя лініі (як любяць казаць) пяройдуць, будзе ім вельмі балюча», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Захад, нягледзячы на свае крокі, насамрэч жудасна баіцца новай маштабнай вайны. «Я сустракаўся з людзьмі, якія не апошнюю ролю адыгрываюць у гэтым і прымаюць радыкальныя, кардынальныя і канчатковыя рашэнні ў выпадку «калі». Яны больш за ўсё баяцца (і пра гэта шчыра ўсе гавораць) ядзернай катастрофы. Яны баяцца прымянення ядзернай зброі ва Украіне. Гэта зразумела. Мы таксама не хочам, таксама баімся. Таму што гэта можа прывесці, як спецыялісты гавораць, да сусветнай катастрофы, і шарык можа з арбіты сысці, калі гэтая ўся зброя выбухне», — сказаў Прэзідэнт.

Ён лічыць, што Расія можа прымяніць ядзерную зброю, калі вораг уварвецца на яе тэрыторыю і гэтая агрэсія будзе пагражаць існаванню дзяржавы. «З кута ж толькі наперад можна выйсці. Вось тады чакайце», — вобразна выказаўся кіраўнік дзяржавы.

«ВА УКРАІНЕ ЛЮДЗІ ХОЧУЦЬ ЖЫЦЬ»

Аляксандр Лукашэнка пераканаўся, што пакуль ёсць магчымасць, неабходна дамаўляцца. Аднак Захад, паводле яго слоў, не дазваляе Украіне ісці на перагаворы. «Хоць я ўпэўнены і маю такую інфармацыю, што ва Украіне сёння пераважная большасць людзей жадае спыніць вайну, у тым ліку вайскоўцаў, якія ваююць, гінуць там. Але ёсць распіяраныя вярхі на чале з Валодзем Зяленскім. Ён цяпер «герой», шастае па ўсім свеце. Яго цалуюць, абдымаюць і гэтак далей. Я думаў, ён разумнейшы. У нас жа ёсць прыклад Гарбачова: цалавалі — і што атрымалі? Дакладна так будзе ў яго», — упэўнены Прэзідэнт.

«І потым. Ва Украіне людзі хочуць жыць. Што б там ні было, мы потым разбяромся, хто вінаваты. Гэта таксама будзе не на іх карысць. Але цяпер трэба спыніць вайну, каб людзі не гінулі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён таксама звярнуў увагу на першыя вынікі ўкраінскага контрнаступлення: Украіна страціла значную колькасць салдат і бранятэхнікі. «Расія мабілізавалася, яна нарэшце навучылася ваяваць. І па ўсіх правілах ваюе, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Атакаваць тых, хто абараняецца, вельмі цяжка. І я думаю, што гэта не атрымаецца».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на сітуацыю ў Еўрапейскім саюзе: людзі незадаволеныя пагаршэннем эканамічнага становішча ў сваіх краінах на фоне выдзялення мільярдаў долараў на дапамогу Украіне. «Ужо пачынаецца процідзеянне знутры ўсяму таму, што адбываецца», — канстатаваў ён.

НАВОШТА ЯДЗЕРНАЯ ЗБРОЯ?

Адной з тэм інтэрв'ю стала размяшчэнне расійскай ядзернай зброі ў Беларусі. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што гэта не Расія імкнецца размясціць свае ядзерныя ракеты ў Беларусі, а Беларусь спачатку прасіла аб тым, а потым стала патрабаваць вярнуць зброю, якая калісьці тут знаходзілася. «Я не проста яго прасіў, я ўжо патрабаваў: «Вярні мне ядзерную зброю». Не трэба стратэгічную. Яна мне навошта? З Амерыкай я ж не збіраюся ваяваць. Тактычнай дастаткова. Так, мы дамовіліся. Мы выконваем гэта, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мэтай мы былі заўсёды. Нас парваць на кавалкі з 2020 года хацелі. Супраць ядзернай краіны, краіны, якая валодае ядзернай зброяй, ніхто яшчэ не заяваў».

«Як толькі ўсё завязём, яна будзе разгрупавана па Беларусі. У нас жа сховішчаў гэтых, як сабак у вёсцы. Сур'ёзна. У нас іх было шмат. Мы іх ужо пяць-шэсць аднавілі. Будзем больш аднаўляць. І мы разгрупуем. Мы не будзем жа трымаць у адным месцы», — дадаў Прэзідэнт.

«Вось часта чую: «А, вось гэта расійская зброя. Без Расіі ён не прыменіць». Слухайце, калі пачнецца вайна, я што, буду глядзець па баках? Ды не. Зняў трубку, дзе б ён ні быў. Ён патэлефанаваў — я зняў трубку ў любы момант. Нават вось цяпер. Таму што тут за праблема — узгадніць нанясенне нейкага там удару. Гэта не пытанне. Тут спрачацца нават няма чаго. Тут мы ўжо дамовіліся. Няхай ворагі, Оля, дрыжаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь гатовая да любога развіцця падзей і без ваганняў адкажа на агрэсію. «Супраць ядзернай краіны, краіны, якая валодае ядзернай зброяй, ніхто яшчэ не заяваў. І я адкрыта ім кажу: мы мірныя людзі, Беларусь наваявалася. У нас прыгожая краіна, чыстая. Расіяне з задавальненнем едуць, — заўважыў Прэзідэнт. — Але цэнтр Еўропы. У гэтым наша праблема. Туды ідуць праз нас, адтуль ідуць праз нас. Таму сітуацыя няпростая, і мы да ўсяго гатовыя».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь адкажа на любую агрэсію супраць яе. «У нас дастаткова ўжо цяпер моцы для таго, каб адказаць, — заявіў ён. — Шмат хто кажа: «Ну, Бацька, вы ж ведаеце, ён такі...» Так. Я такі, калі гаворка ідзе пра мой народ, пра маю дзяржаву. І потым, я ж не дазволю (мы стваралі тут, карачыліся чвэрць стагоддзя, разам з беларускім народам стваралі незалежную дзяржаву) аддаць 10 мільёнаў на разарванне. А расіян колькі тут? Яшчэ мільёны тры пастаянна. Вось 13 мільёнаў, я за іх адказваю. Без ваганняў, калі толькі будзе здзейснена супраць нас агрэсія».

«ВОСЬ КАЛІ ЯНЫ ВОЙСКАМІ ПЯРОЙДУЦЬ ГРАНІЦУ...»

«Вылазкі на граніцы — гэта яшчэ не агрэсія? Атака ў Мачулішчах — гэта яшчэ не агрэсія?» — удакладніла журналістка.

«Не, гэта далёка яшчэ не агрэсія. З такімі «мачулішчамі» мы спраўляемся і справімся. І з граніцай таксама. Гэта правакацыі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Нават падзеі ў Белгародскай вобласці Расіі, паводле яго слоў, — гэта яшчэ далёка не агрэсія. «Гэта вельмі адчувальная, моцная правакацыя, дзе мы недапрацоўваем, — сказаў ён. — Цяпер пачалі дапрацоўваць. Упрэгліся ў гэту праблему».

Прэзідэнт расказаў, што ў СМІ трапляе мала інфармацыі, але Беларусь і Расія сумесна працуюць у дадзеным напрамку, спыняючы розныя пагрозы. Так, нядаўна спецслужбы выявілі і «вялі» дыверсанта, а потым, каб не ўпусціць, затрымалі яго ў Смаленску.

У час інтэрв'ю кіраўнік беларускай дзяржавы выказаўся аб сваіх «чырвоных лініях». «Ніколі нельга, гаворачы аб «чырвоных лініях», іх маляваць. Таму што жыццё мяняецца і лініі рухаюцца то наперад, то назад. Яны заўсёды ёсць і ў нас, і ў іх. У расіян і ва ўкраінцаў. Але палітычна лепш не агучваць, якія яны: жыццё тое мяняе. «Чырвоныя лініі» для мяне — гэта поўнамаштабная агрэсія. З любога боку цяпер, акрамя Расіі, зразумела. А вось Прыбалтыка, Польшча і Украіна...» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы ўдакладніў, што вайскоўцы класіфікуюць акты агрэсіі. «Вось калі яны войскамі пяройдуць граніцу, не гэтымі атрадзікамі (дыверсійнымі групамі. — **«Зв.»**), і пачнуць вайну — гэта агрэсія», — растлумачыў Прэзідэнт.

ХТО ДАПАМОГ АРГАНІЗАВАЦЬ ПЕРАГАВОРЫ З ЗЯЛЕНСКІМ

Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў, як арганізоўваліся перагаворы паміж дзвюма краінамі. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, немалую ролю тут адыграў яго малодшы сын Мікалай, які дапамог арганізаваць тэлефонную размову з Уладзімірам Зяленскім. Пасля доўгай гутаркі Прэзідэнт Украіны ўрэшце пагадзіўся правесці перагаворы з расійскім бокам на тэрыторыі Беларусі. Пасля яны былі перанесены ў Стамбул, на гэтым настойваў Захад.

«Пуцін мне перадае дакумент, які быў парафіраваны дэлегацыямі. Нармальны, нават па Крыме — арэнда там нейкая працяглая, па Данбасе, на ўсходзе... Нармальны дагавор. Калі б гэта цяпер — а цяпер ужо немагчыма. Цяпер гэта ўжо тэрыторыя Расіі па Канстытуцыі. А быў нармальны праект, і ўжо дамаўляліся, што МЗС парафіруюць і ў далейшым павінны вызначыцца кіраўнікі дзяржаў, падпісваюць і іншае. Добры быў працэс, але яны ад яго адмовіліся», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы сказаў, што Мікалай цяпер вучыцца ў Пекінскім універсітэце, але да гэтага часу падштурхоўвае да арганізацыі перагавораў. «Кажу: я разумею, але ты яшчэ не ўсё разумееш», — дадаў Прэзідэнт.

У той жа час ён звярнуў увагу, што Захаду ў гэтым працэсе верыць нельга. Нават Мінскія пагадненні для іх аказаліся ўсяго толькі паўзай, каб за мінулыя гады паспець нарасціць ваенную моц ва Украіне.

«Тут толькі можа быць адно. Калі мы дамаўляемся аб мірным працэсе, вайна спыняецца, ніякага руху: ні танкаў, ні ваенных. Як толькі пераканаты, я лічу, што мы павінны прымяняць ядзерную зброю. Толькі так з імі можна размаўляць. З імі нельга весці дыялог і верыць. Падмануць», — пераканаў Аляксандр Лукашэнка.

«ЁН НЕ ВЕДАЕ, ШТО ТВОРЫЦЬ»

Адно з пытанняў кіраўніка дзяржавы датычылася яго адносін да персоны Уладзіміра Зяленскага, якога ён назваў «гнідай», расказваючы аб спробе дывэрсіі адносна самалёта А-50 на аэрадроме Мачулішчы і затрыманні вінаватых. «Гэта добра, гэта бліскуча праведзеная аперацыя. Здзейснена неверагоднае, каб за нейкія 4-5 дзён устанавіць усіх саўдзельнікаў і затрымаць. Знайсці іголку ў стозе сена. Але расслабляцца ні ў якім разе нельга, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка 7 сакавіка 2023 года. «Выснова адна. Я яшчэ неяк думаў, што Украіне патрэбны мір, што Зяленскі хварэе за свой народ. Прэзідэнт Зяленскі — проста гніда. Проста гніда! Такія аперацыі не праводзяцца без узгаднення з кіраўніком краіны і галоўнакамандуючым. Гэта я вам кажу як Прэзідэнт».

«У мяне няма да яго нейкай азлобленасці, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанне Вольгі Скабеевай. — Калі б на яго месцы быў Пуцін, я на яго быў бы злы, таму што чалавек цяміць, што ён робіць, ён ведае, што такое вайна, ён ваенны чалавек».

«Валодзя Зяленскі — ён не спецыяліст, не прафесіянал, хоць ён за гэты час вырас, ён спазнаў гэтай пасады да СВА, таму ён павінен быў разумець, — працягнуў кіраўнік дзяржавы. — Калі ты ў гэты воз упрогся, дык ты ўжо адказвай». Аляксандр Лукашэнка лічыць, што за час свайго прэзідэнцтва Уладзімір Зяленскі «сёе-тое ўжо засвоіў, таму і запытанне з яго павінна быць».

Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, Уладзімір Пуцін, калі гаворка заходзіць пра Зяленскага, таксама кажа аб ім без злосці і, у прынцыпе, без асаблівых эмоцый: «Пуцін абыякава да яго ставіцца, нібыта яго няма. У яго такі ж пункт гледжання па Зяленскім, як у мяне: што гэты чалавек не ведае, што творыць».

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

Парламенцкі дзённік

У адпаведнасці з нацыянальнымі інтарэсамі

Члены Савета Рэспублікі прынялі шэраг законапраектаў

Адзін з іх — праект Закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» — рэгулюе дзейнасць у інфармацыйнай сферы. Дакумент накіраваны на забеспячэнне канстытуцыйнага права грамадзян на атрыманне поўнай і дакладнай інфармацыі. Навацыі таксама датычацца абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў сферы масавай інфармацыі.

Як заўважыў, прадстаўляючы законапраект у Савеце Рэспублікі, **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ,** сёння СМІ з'яўляюцца наймагутнейшым фактарам уплыву на насельніцтва. «Беларуская інфармацыйная прастора па-ранейшаму застаецца адкрытай для замежных СМІ, якія выконваюць патрабаванні заканадаўства Рэспублікі Беларусі, — адзначыў ён. — У нас распаўсюджваецца 1790 замежных газет і часопісаў, звыш 225 замежных тэлеканалаў».

Па словах кіраўніка інфармацыйнага ведамства, законапраект распрацаваны з мэтай забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь у інфармацыйнай сферы, абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў у галіне масавай інфармацыі з улікам глабальных геапалітычных змяненняў, новых тэхналагічных рэалій і выклікаў. «Цяпер ужо відавочна, што далёка не заўсёды інтэрнэт служыць развіццю грамадства і дзяржавы, віртуальнае асяроддзе стала інструментам інфармацыйных войнаў, накіраваных на разбурэнне грамадскіх устояў, маральных каштоўнасцяў, а часам і цэлых дзяржаў, — звярнуў увагу Уладзімір Пярцоў. — Даступнасць інтэрнэту шырокай аўдыторыі Беларусі надае дадзенай праблеме асаблівы характар. Менавіта таму шэраг навацый законапраекта накіраваны на ўдасканаленне правадносін у сетцы Інтэрнэт, абарону нацыянальнай інфармацыйнай прасторы».

Як адзначыў **член Савета Рэспублікі Андрэй ШЫШКІН,** нікому не трэба даказваць тое, што супраць Беларусі вядзецца самая сапраўдная інфармацыйная вайна. «Дастаткова зайсці ў інтэрнэт ды паглядзець спадарожнікавыя тэлеканалы, і ўбачыце, колькі негатыву, шматлікіх недакладных звестак распаўсюджваецца замежнымі медыя, — удакладніў сенатар. — Многія з іх пры гэтым не з'яўляюцца СМІ, а створаны як магутныя прапагандысцкія рэсурсы, якія фінансуюцца шматлікімі замежнымі структурамі. Да чаго прыводзіць такая работа, усе мы бачылі ў 2020 годзе. Мэта гэтых рэсурсаў — раскалоць беларускае грамадства, справакаваць канфлікты па нацыянальнай, рэлігійнай і іншых прыкметах і ў канчатковым выніку паспрабаваць арганізаваць чарговую «каляровую рэвалюцыю». Мы памятаем, як гэта было ў 2020 годзе, вынеслі ўрок з таго складанага перыяду і паўтарыць падобнага не можам. У сувязі з чым і ўзнік законапраект, які прадугледжвае змяненні ў заканадаўства аб СМІ».

Сенатары ратыфікавалі таксама шэраг пратаколаў і пагадненняў.

Вераніка КАНЮТА.

Сацыяльны вектар

ТОЕ, ШТО ХВАЛЮЕ КОЖНАГА

Ігар ПЕТРЫШЭНКА расказаў аб сучасным стане і перспектывах развіцця сацыяльнай сферы

З адпаведным дакладам намеснік прэм'ер-міністра выступіў на сумесным пасяджэнні членаў Савета Рэспублікі і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Віцэ-прэм'ер закрануў ключавыя аспекты развіцця грамадства: расказаў, якія змены ў хуткім часе чакаюць сферы медыцыны і адукацыі, праанансаваў новыя культурныя і спартыўныя праекты, вызначыў напрамкі развіцця медыйнай сферы і выказаўся аб важнасці патрыятычнага выхавання моладзі.

У нашай краіне традыцыйна забяспечваецца захаванне сацыяльнага вектара расходаў дзяржавы. На фінансаванне галін сацыяльнай сферы штогод накіроўваецца не менш як 12 % ВУП, або звыш 40 % расходаў кансалідаванага бюджэту. Сёлета на фінансаванне сацыяльнай сферы запланавана 27,5 млрд рублёў, або 43 % ад кансалідаванага бюджэту.

Медыцына: якасная і даступная

Закранаючы найбольш вострую тэму, якая хвалюе кожнага грамадзяніна, Ігар Петрышэнка заявіў, што пытанні сістэмы аховы здароўя знаходзяцца пад самай пільнай увагай урада. Па ўсіх недахопах, якія існуюць, па яго словах, распрацаваны канкрэтныя меры.

Намеснік прэм'ер-міністра расказаў, што праведзена інвентарызацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя. «Вызначаны 105 арганізацый, якія патрабуюць правядзення капітальнага рамонту, і 933 — бягучага, — заўважыў ён. — На гэтыя мэты выдзелена больш за 210 мільёнаў рублёў».

Спыніўшыся на кадравым забеспячэнні медыцынскай сферы, Ігар Петрышэнка адзначыў, што павялічаны кантрольныя лічбы прыёму за кошт сродкаў бюджэту, а таксама пашыраны мэтавы набор. Для павышэння замацаванасці маладых спецыялістаў-мэтавікаў па месцы адпрацоўкі ўзмоцнены ўмовы пераразмеркавання для дадзенай катэгорыі спецыялістаў.

— Узмоцнены кантроль за забеспячэннем даступнасці медыцынскай дапамогі на ўсіх узроўнях яе аказання, — акцэнтаваў увагу Ігар Петрышэнка. — Прыпынена скарачэнне ФАПаў. Перагледжаны табель аснашчэння гэтых пунктаў і машын хуткай медыцынскай дапамогі: як па лекавых прэпаратах, так і па медыцынскіх вырабах. Арганізаваны пастаянны маніторынг за максімальна эфектыўным выкарыстаннем высокатэхналагічнага медыцынскага абсталявання. Да канца года будзе завершана пераразмеркаванне наяўнага абсталявання паміж арганізацыямі аховы здароўя з улікам яго запатрабаванасці. У мэтах правядзення якаснай сістэмнай дыспансерызацыі ва ўстановах аховы здароўя выдзелена 1315 асобных кабінетаў.

Праводзяцца дадатковыя меры і па своечасовым выяўленні злаякасных новаўтварэнняў: як у дзяцей, так і ў дарослага насельніцтва. Частка абследаванняў, якія раней выконваліся ў рамках скрынінгу, перанесена ў праграму правядзення дыспансерызацыі. У бягучым годзе скрынінгам будзе ахоплена больш як 325 тысяч чалавек. Што датычыцца эндапратэзавання, то перад Міністэрствам аховы здароўя пастаўлена задача павялічыць аб'ёмы такіх аперацый — не менш як да 14 тысяч аперацый у год.

Спыніўшыся на пытанні лекавага забеспячэння, віцэ-прэм'ер адзначыў, што доля айчынных лекаў на ўнутраным рынку стабільна складае больш за 50 %. Запланавана далейшае пашырэнне лінейкі прэпаратаў: як уласнай распрацоўкі, так і ў рамках кааператыўнага супрацоўніцтва з замежнымі кампаніямі. Пытанне цэнавай і асартыментнай даступнасці для насельніцтва неабходных лекавых сродкаў таксама знаходзіцца на кантролі ўрада.

Адукацыя: карысць і недахопы рэформаў

Яшчэ адно з топ-пытанняў, якое традыцыйна хвалюе грамадзян, — адукацыя, аб чым сведчаць і апошнія падзеі з цэнтралізаваным экзаменам. Намеснік прэм'ер-міністра падкрэсліў, што сёлета ўрадам будуць выпрацаваны канчатковыя рашэнні па правядзенні ўступнай кампаніі, у тым ліку па выбары найбольш аптымальнай формы школьных экзаменаў і ўступных іспытаў — менавіта такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы. «Вынікі ўступнай кампаніі бягучага года будуць дэталёва прааналізаваны дзяржаўнай камісіяй, — заявіў Ігар Петрышэнка. — Будуць вывучаны думкі ўсіх зацікаўленых: навучэнцаў, іх бацькоў, педагогаў».

У той жа час віцэ-прэм'ер адзначыў, што шэраг актуальных пытанняў у сферы адукацыі ўжо вырашаны або вырашаецца. У прыватнасці, урэгулявана пытанне харчавання работнікаў устаноў дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі. Што датычыцца харчавання навучэнцаў, урад правёў сур'ёзную работу, арганізаваўшы эксперымент у 23 школах ва ўсіх рэгіёнах краіны, падчас якога вывучаліся смакавыя перавагі дзяцей. Вынікі эксперыменту будуць укаранёны ва ўсіх школах з новага навучальнага года.

На пастаянным кантролі ўрада знаходзіцца і пытанне даступнасці адукацыі на ўсіх узроўнях. «Толькі ў асобных мікрараёнах з інтэнсіўнай жылой забудовай, напрыклад у Мінскім раёне, захоўваецца актуальнасць у выдзяленні месцаў у дзіцячыя садкі ў крокавай даступнасці, але гэта пытанне, якое вырашаецца, — удакладніў намеснік кіраўніка ўрада. — Да канца 2023 года запланаваны ўвод 15 дзіцячых садкоў на 3215 месцаў, рэканструкцыя чатырох устаноў адукацыі, а таксама стварэнне месцаў у групах кароткачасовага знаходжання для дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту».

Што датычыцца ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, Міністэрствам адукацыі працягваецца работа па іх аптымізацыі і рэарганізацыі. Прычым, як падкрэсліў Ігар Петрышэнка, пры прыняцці рашэння эканомія сродкаў не з'яўляецца асноватворным фактарам. «Галоўнае — гэта забеспячэнне роўных умоў для атрымання якаснай адукацыі ўсімі навучэнцамі, у тым ліку тымі, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, і навучэнцамі ў малакамплектных школах», — канкрэтызаваў ён.

Дзяржаўная падтрымка: адрасна і ў поўным аб'ёме

Кожны чацвёрты жыхар нашай краіны — атрымальнік пенсійных выплат. У маі з улікам праведзенага пераразлiку сярэдні памер пенсіі па ўзросце непрацуючага пенсіянера склаў 703 рублі. Забяспечана павышэнне ўзроўню рэальнага памеру пенсійных выплат — 109,7 % (за студзень—красавік). Як адзначыў Ігар Петрышэнка, рашэнне аб далейшым павышэнні пенсій будзе прымацца з улікам сітуацыі ў эканоміцы і, перш за ўсё, зыходзячы з росту зарплаты работнікаў.

Першачарговая ўвага дзяржавы ўдзяляецца і падтрымцы сем'яў з дзецьмі. Сістэмай матэрыяльных дапамог ахоплена каля 400 тысяч дзяцей. У бягучым годзе на іх выплату ў бюджэце прадугледжана 3,5 млрд рублёў. У рамках рэалізацыі праграмы сямейнага капіталу з 2015 года на падтрымку шматдзетных сем'яў на дэпазітныя ўклады залічана 826 мільёнаў долараў ЗША, а таксама больш за 1 млрд беларускіх рублёў, у тым ліку 360 млн летась. Больш за 125 тысяч шматдзетных сем'яў ужо скарысталася гэтымі сродкамі, у тым ліку 68 тысяч — датэрмінова.

«Меры фінансавай падтрымкі сем'яў, безумоўна, важныя, але думаю, што нам трэба больш актыўна прапрацоўваць і іншыя формы ды магчымасці павышэння зацікаўленасці сучасных маладых пар у нараджэнні дзяцей, — перакананы віцэ-прэм'ер. — Перш за ўсё тут важная работа з наймальнікамі, у тым ліку па стварэнні сямейна арыентаваных рабочых месцаў».

Ва ўмовах аб'ектыўных дэмаграфічных працэсаў, звязаных з павелічэннем долі асоб пажылога ўзросту, усё большую значнасць набываюць пытанні развіцця сістэмы сацыяльнага абслугоўвання. Сёння ў краіне функцыянуюць 146 тэрытарыяльных цэнтраў і 91 дом-інтэрнат. «Колькасць атрымальнікаў сацыяльных паслуг сярод пажылых і інвалідаў штогод узрастае і сёння складае больш за 160 тысяч чалавек, — заўважыў намеснік прэм'ер-міністра. — Гэта найвышэйшы паказчык за апошнія пяць гадоў. У якасці станоўчага моманту хачу адзначыць, што толькі 19 тысяч з іх пражываюць ва ўмовах стацыянараў».

Для якаснага і своечасовага аказання сацыяльнай падтрымкі, асабліва ў сельскай мясцовасці, развіваецца інфраструктура тэрытарыяльных цэнтраў. Летась адкрыты пяць новых аддзяленняў, два філіялы і 14 сацыяльных пунктаў.

Культура: абнаўленне рэпертуараў і акцэнт на моладзь

«Цяпер выпрацаваны падыходы да змянення механізма фінансавання дзяржаўных тэатраў у адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы, — удакладніў Ігар Петрышэнка. — Сутнасць гэтых падыходаў у парытэтным фінансаванні тэатраў з бюджэту і з уласных даходаў. Устанаўленне прамой залежнасці аб'ёмаў бюджэтнага фінансавання ад уласных даходаў павысіць зацікаўленасць работнікаў у выніках дзейнасці тэатра».

Удасканальваецца сістэма фінансавання кінавытворчасці і адбору кінапраектаў, вядзецца маштабная праграма па забеспячэнні арганізацый культуры і ўстаноў адукацыі музычнымі інструментамі, ствараюцца неабходныя ўмовы для творчага развіцця дзяцей і моладзі.

Спорт і турызм: масава і цікава

Як расказаў Ігар Петрышэнка, летась вырасла з 2,6 да 2,7 тысячы колькасць спартыўных груп і секцый, якія функцыянуюць у 144 фізкультурна-спартыўных клубах, больш стала і рэспубліканскіх, рэгіянальных спартыўна-масавых мерапрыемстваў.

«Для спорту вышэйшых дасягненняў 2022 год і першая палова 2023 года былі дастаткова складанымі з-за неабгрунтаваных і надуманых санкцый міжнародных спартыўных арганізацый, якія, тым не менш, не разбурылі яго, — звярнуў увагу віцэ-прэм'ер. — Дзякуючы зладжанай рабоце арганізаваны сумесныя мерапрыемствы з Расійскай Федэрацыяй, якія забяспечылі асноўны склад нацыянальных каманд, а таксама найбліжэйшы рэзерв неабходнай спаборніцкай практыкай. У 2022 годзе адбылося 509 спаборніцтваў і вучэбна-трэніровачных збораў, з іх 205 — на тэрыторыі нашай краіны. У многіх відах спорту канкурэнцыя на гэтых стартах нават вышэйшая, чым на міжнародных».

Намеснік прэм'ер-міністра ўдакладніў, што кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапановы ўрада па змяненні сістэмы матэрыяльнага стымулявання спартсменаў ва ўмовах уведзеных санкцый. Гэта дало магчымасць захаваць іх стыпендыяльнае забеспячэнне і прызавыя выплаты ў рамках даступных спаборніцтваў.

«Праводзіцца вялізная работа па вяртанні нашых спартсменаў на міжнародныя старты, — удакладніў Ігар Петрышэнка. — Па 21 відзе спорту беларусы ўжо дапушчаны да міжнародных спаборніцтваў».

Адной з галоўных спартыўных падзей бягучага года стане правядзенне ў нашай краіне II Гульняў краін СНД, якія пройдуць з 4 да 14 жніўня ў 11 гарадах ва ўсіх абласцях і горадзе Мінску. Па словах віцэ-прэм'ера, яны прадэманструюць удзельнікам і гасцям, што не толькі сталіца здольная прымаць буйныя спартыўныя мерапрыемствы, а спартыўная база розных гарадоў Беларусі адпавядае самым высокім стандартам.

Правядзенне Гульняў — гэта і магчымасць прадэманстраваць турыстычныя магчымасці нашых рэгіёнаў. У сферы турызму працягвае набіраць абароты ўнутраны турызм. Яшчэ ў 2021 годзе колькасць беларусаў, якія падарожнічаюць па сваёй краіне, павялічылася ў два разы і з таго часу прадаўжае толькі расці, складаючы цяпер больш як 1,3 мільёна чалавек. Самымі папулярнымі відамі ў беларусаў застаюцца санаторна-курортнае лячэнне і аграэкатурызм. У апошні час усё больш увагі прыцягваюць такія віды актыўнага адпачынку, як байдарачныя сплавы, веласіпедныя прабегі і экскурсіі, экалагічны турызм. Для іх развіцця ствараецца спецыяльная інфраструктура і прадумваюцца дадатковыя меры.

Наталля КАЧАНАВА:

❍ У тэму

«САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА — НАШ НАЦЫЯНАЛЬНЫ БРЭНД»

На сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі спікер верхняй палаты парламента нагадала, што наш Прэзідэнт заўсёды аддае самую пільную ўвагу пытанням сацыяльнай палітыкі і патрабуе безумоўнага захавання яе ключавых прынцыпаў: справядлівасці, адказнасці дзяржавы перад грамадствам, клопату аб людзях. «Больш за тое, у ходзе Паслання беларускаму народу і парламенту кіраўнік дзяржавы назваў сацыяльную справядлівасць у ліку найважнейшых умоў захавання суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны», — адзначыла Наталля Качанава.

Як заўважыла спікер верхняй палаты парламента, у многім на аснове ацэнкі сацыяльнай сферы фарміруецца грамадская думка аб эфектыўнасці і неабходнасці асобных дзяржаўных структур, давер насельніцтва да ўлады і адносіны да краіны ў цэлым. «Пры бясспрэчна высокіх выніках па ўсіх напрамках сацыяльнай палітыкі нядаўнія нарады ў Прэзідэнта нашай краіны па ахове здароўя і адукацыі выявілі шэраг пытанняў, над якімі трэба сур'ёзна працаваць», — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава.

Медыя: надзейна і прафесійна

Даючы ацэнку дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі, намеснік прэм'ер-міністра назваў медыйнае поле Беларусі насычаным і разнастайным. На цяперашні момант выдаецца 955 газет і часопісаў, працуе 186 тэлерадыёканалаў, сем інфармацыйных агенцтваў, 49 сеткавых выданняў. Акрамя таго, на нашым інфармацыйным полі функцыянуе каля трох тысяч замежных СМІ, пераважна рускамоўных.

Віцэ-прэм'ер акцэнтаваў увагу на тым, што ў апошні час новыя тэхналогіі і падыходы ў развіцці медыясферы фарміруюць і новыя пагрозы для нацыянальнай бяспекі. «Таму актыўнае развіццё нашай інфармацыйнай прасторы павінна суправаджацца яго надзейнай абаронай», — лічыць ён.

Як заўважыў Ігар Петрышэнка, прыярытэтам для айчынных СМІ з'яўляецца стварэнне якаснага прафесійнага медыяпрадукту. «На фоне фэйкавых навін і ўкідаў нашы СМІ цвёрда адстойваюць дзяржаўныя інтарэсы і прыярытэты, — падкрэсліў ён. — Аператыўна выбудоўваецца інфармацыйны парадак дня, абнаўляецца кантэнт навін, максімальна прадумана фарміруецца аналітычны складнік».

Улічваючы рост інтэрнэт-аўдыторыі рэдакцый, урадам пастаўлена задача прасоўвання і ўмацавання дзяржаўнай пазіцыі ў інтэрнэт-прасторы.

Моладзь: з акцэнтам на патрыятызм

У завяршэнні выступлення Ігар Петрышэнка спыніўся на рабоце з моладдзю. «Сёння яшчэ больш важнае тое, чаму моладзь навучыцца ў час свайго сталення, якія традыцыі і каштоўнасці ўбярэ, на якія ідэалы будзе арыентавацца, — перакананы віцэ-прэм'ер. — Мы бачым на прыкладзе іншых краін, як лёгка моладзь паддаецца негатыўнаму ўздзеянню, асабліва ў сучасным лічбавым асяроддзі. На жаль, часта ўздзеянне сацсетак, таго ж «Ціктока», на дзяцей мацнейшае, чым бацькоўскі ўплыў».

У сувязі з гэтым урадам перад Міністэрствам адукацыі пастаўлена задача арганізаваць эфектыўную выхаваўчую работу, у першую чаргу звярнуць асаблівую ўвагу на пытанне патрыятычнага выхавання. Далучыцца да найважнейшай справы выхавання падрастаючага пакалення Ігар Петрышэнка заклікаў і парламентарыяў.

Вераніка КАНЮТА.

МЕДЫКАЎ І ПЕДАГОГАЎ ПАТРЭБНА БОЛЬШ

На якія спецыяльнасці набор павялічаць і якія прафесіі папулярныя ў абітурыентаў?

Учора пачаўся чарговы этап уступнай кампаніі — абітурыенты прыступілі да здачы цэнтралізаванага тэсціравання па прадметах. У Гомельскай вобласці сёлетніх выпускнікоў школ рыхтуюцца прыняць шэсць ВНУ і 26 устаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Маркуецца, што ВНУ рэгіёна прымуць каля пяці тысяч першакурснікаў і столькі ж стане навучэнцамі каледжаў. Адметнасць сёлетняй уступнай кампаніі — павелічэнне колькасці бюджэтных месцаў на некаторыя спецыяльнасці, у тым ліку педагагічнага і медыцынскага профілю, а таксама пашырэнне мэтавага набору.

Паводле інфармацыі **начальніка галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргея ПІШЧОВА,** каля трох тысяч абітурыентаў ВНУ Гомельшчыны прымуць на бюджэтныя месцы і больш за 1300 — на платную форму навучання. Сёлета на 50 месцаў павялічыцца прыём на медыцынскія спецыяльнасці, таксама вырасце колькасць мэтавікаў. Каля пяці тысяч выпускнікоў чакаюць у 26 каледжах вобласці.

Адметна, што ВНУ рэгіёна размяшчаюцца не толькі ў абласным цэнтры. Атрымаць адукацыю па ўсім спектры педагагічных спецыяльнасцяў запрашае Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна. Тут рыхтуюць пераважна настаўнікаў: з 18 спецыяльнасцяў 16 — педагагічныя ці выкладчыцкія. У адпаведнасці з попытам на рынку працы сёлета тут адкрылі новыя спецыяльнасці — сацыяльны педагог і педагог-псіхолаг.

У бягучым годзе ў Мазырскі ўніверсітэт прымуць 622 абітурыенты на бюджэтныя месцы і яшчэ сто — на платныя.

— Колькасць бюджэтных месцаў павялічылася на 10 %, гэта звязана з тым, што на нашых выпускнікоў высокі попыт, апошнім часам заяўкі на размеркаванне перавышаюць колькасць выпускнікоў, — адзначае **першы прарэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна Ірына КАВАЛЕВІЧ.**

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны будзе прымаць абітурыентаў на 35 спецыяльнасцяў, у бягучым годзе для іх выдаткавана 620 бюджэтных месцаў і 321 — платнае, яшчэ 443 абітурыенты плануюць прыняць на завочную форму навучання. Як адзначыў **адказны сакратар прыёмнай камісіі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Аляксандр РУДЗЯНКОЎ,** сёлета адкрыты набор на новую спецыяльнасць — эканамічнае права, налета на філалагічным факультэце з'явіцца аддзяленне журналістыкі.

Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі, які рыхтуе кадры для гандлёвай галіны, адкрывае прыём па 12 спецыяльнасцях, сярод іх дзве новыя — інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі і электронная эканоміка. Адной з самых запатрабаваных сярод наймальнікаў, паводле слоў **адказнага сакратара прыёмнай камісіі Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі Ларысы ЦЭЛІКАВАЙ,** застаецца спецыяльнасць «Таваразнаўства», на яе ажыццяўляецца прыём на поўную і скарочаную формы навучання.

Адна з самых папулярных у абітурыентаў ВНУ — Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт — чакае студэнтаў па трох кірунках: лячэбная справа, медыка-дыягнастычная справа, медыка-прафілактычная справа. На бюджэтныя месцы факультэта лячэбнай справы сёлета прымуць 400 абітурыентаў. Усяго ва ўніверсітэце вучыцца 3600 будучых дактароў.

Маладых людзей, якіх цікавяць фізіка, матэматыка і інжынерныя спецыяльнасці, чакае Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога. Гэта як класічныя машынабудаўнічы, механіка-тэхналагічны і энергетычны факультэты, запатрабаваны факультэт аўтаматызаваных і інфармацыйных сістэм, дзе рыхтуюць будучых праграмістаў, так і гуманітарна-эканамічны факультэт з новымі спецыяльнасцямі. Як падкрэслівае **адказны сакратар прыёмнай камісіі Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога Вадзім КЛЕЙМАН,** у выпускніках універсітэта зацікаўленыя ўсе прамысловыя прадпрыемствы рэгіёна, у тым ліку «Гомсельмаш» і БМЗ, вялікі попыт у работадаўцаў на будучых праграмістаў.

Звыш тысячы абітурыентаў прыме сёлета Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, якому, дарэчы, у сёлетнім кастрычніку споўніцца 70 гадоў. Тут працуе дзевяць факультэтаў. Найбольш запатрабаваныя ў абітурыентаў такія спецыяльнасці, як тэхналогія транспартных працэсаў, транспартная лагістыка, мытная справа і архітэктура.

Больш за 330 навучэнцаў прыме сёлета Гомельскі аўтамеханічны каледж. Сярод запатрабаваных спецыяльнасцяў — аператар станкоў з праграмным кіраваннем, аўтамеханік, наладчык станкоў і маніпулятараў з праграмным кіраваннем, электразваршчык і іншыя.

— Наш каледж мае выдатную матэрыяльную базу. Мы навучаем працаваць на абсталяванні, якое толькі з'явілася ці з'явіцца на прадпрыемствах заўтра, — дадае **дырэктар Гомельскага дзяржаўнага аўтамеханічнага каледжа Генадзь КАЗЛОЎ.**

Па папулярных у моладзі сёння прафесіях у сферы грамадскага харчавання — кухар, кандытар, пекар, афіцыянт, тэхнік-тэхнолаг — рыхтуюць у Гомельскім дзяржаўным каледжы кулінарыі. Як расказаў яго **дырэктар Уладзіслаў ШЭПЯЛЕВІЧ,** з-за запатрабаванасці выпускнікоў наборы былі павялічаны, а летась навучальная ўстанова пачала прымаць і выпускнікоў 9-х класаў. Больш за тое, усе навучэнцы праходзяць практыку на аплачваемых месцах.

Запатрабаванымі на рынку працы спецыяльнасцямі прыцягвае маладых людзей Рагачоўскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж будаўнікоў. Сярод самых папулярных — плітачнік, тынкоўшчык, маляр, сталяр, муляр, электрагазазваршчык. Ёсць і прафесіі для дзяўчат — швачка і цырульнік.

Алена КРАВЕЦ.

Па сутнасці

ШЛЯХ ДАДОМУ

У жыцці кожнага юнака і дзяўчыны Беларусі настае такі час, калі яны, апантаныя, трапляюць на ростані жыцця. Каб было лягчэй рушыць наперад, дапамагаюць бацькі і таксама дзяржава. Першае працоўнае месца гарантавана законам. Калі яшчэ не стаў на прафесійнае крыло, перад табой нават не адкыняюць, а расчыняюць дзверы. Інакш малады спецыяліст наўрад ці вытрымае канкурэнцыю. Размеркаванне — гэта і сацыяльная падтрымка моладзі, і элемент стратэгічнага менеджменту. Дзяржава на некалькі гадоў наперад падлічвае, колькі і ў якіх рэгіёнах ёй патрэбна мець тэрапеўтаў, а колькі — інжынераў па тэхніцы бяспекі. Адсюль складаюцца лічбы бюджэтных месцаў ва ўніверсітэтах.

Узяць тых жа мэтавікоў. Адкуль атрымаў пуцёўку ў жыцці, туды і вяртаешся. Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся. Шмат плюсоў. На малую радзіму. Дзе заўжды падтрымаюць бацькі, ды і старэйшыя калегі — землякі — нібы настаўнікі. А тыя, хто накіроўваў, таксама ведаюць чалавека: умоўна кажучы — на вачах вырас.

Хапае, вядома, і нюансаў. Бюджэтнае месца для навучання гарантаванае мэтавіку, але ці будзе гэта найлепшы з абітурыентаў, ды і як пасля да навучання будзе ставіцца. Амаль чырвоную дывановую дарожку яму расаслалі. Але, напэўна, што лёгка даецца, тое не вельмі цэніцца. Ды што рабіць, калі на перыферыю выдатнікі не вельмі спяшаюцца. Атрымае веды, дыплом за дзяржаўны кошт, яго чакаюць, на яго разлічваюць. А ён нават «дзякуй» не скажа. Замест такога неабходнага ветэрынара, якому ўжо і дом будуецца, краіна атрымлівае чарговага менеджара па дастаўцы піцы. Небараку, які вымушаны туляцца па здымных кватэрах і пакоях сталіцы. Рэнта нятанная. І чалавек з дыпломам займаецца некваліфікаванай працай. Грошай шмат не заробіш, аўтарытэт — таксама. Вось так і нараджаюцца «вечныя мастакі». Незадаволеныя сабой, яны бадзяюцца па жыцці і нярэдка па мяцежных маршах. Шукаюць сябе таму, што страцілі бацькаўшчыну.

Ёсць іншы сцэнарый. За кошт краіны, за грошы падаткаплацельшчыкаў назбіраць багаж ведаў і з торбай (цяпер модна з заплечнікам) — у валацугі па іншаземных хостэлах. Вядома, ёсць гісторыі замежнага поспеху. Як і суровая рэчаіснасць — не заўжды на малой радзіме мэтавікам — масленіца, камандзіца. За гэтым трэба сачыць. Але ў цэлым прыём цёплы. Як і з валацугамі — толькі бацькі ведаюць гэтыя гісторыі «поспеху». Тут ён добры спартсмен, а на чужым беразе вымушаны браць удзел у спрынце за нізкааплатную работу. Блудныя дзеці, радзіма чакае.

Ці не гэта страчаная спадчына? Маральны аспект. Уявіце: бацькі выпесцілі, адправілі ў жыццё, а ён забыўся дарогу дадому. У яго шырокія гасцінцы, а замест смачнай калодзежнай вады — заморскія напоі з хімікатамі. Дзеці, якія забываюць бацькоў, і тыя, хто хаваецца ад размеркавання, ці не тое ж самае? Ці гэта праблема дзяржавы? Мабыць, перш за ўсё — праблема выхавання. І наступствы касмапалітычнай ідэалогіі. Справа ў тым, што ад сябе не ўцячэш. Хата бацькоў не тое што не прадаецца, яе нельга забыць. Нават птушкі вяртаюцца ў свае гнёзды. І абавязкова на радзіму — каб стварыць сваё. Радзіма, дарэчы, сугучная са словамі «род» і «нараджэнне».

На малой радзіме, у Белавежжы, у хаце бацькоў, якая не прадаецца, мы зімой заўжды падкормліваем птушак. Дык пасля ранняй вясной, як толькі сыдзе снег, птушкі тыя такія канцэрты даюць! Зусім побач, за плотам, — гай, пушчанскія шаты. Дык усе крылатыя певуны злятаюцца на двор і як толькі ўбачаць на вуліцы маму, так шчыруюць! Пра што гэта я? Пра тое, што птушкі ўмеюць дзякаваць. А людзі, якія робяць першыя крокі ў дарослае жыццё? Забыць родны кут — гэта ж не па-людску.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кангрэс ЗША ўнеслі артыкулы аб імпічменце Джо Байдэну

Член Палаты прадстаўнікоў ЗША Ларэн Боберт унесла ў Кангрэс артыкулы аб імпічменце кіраўніку Белага дома Джо Байдэну з-за яго нездольнасці гарантаваць бяспеку паўднёвых граніц краіны. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны». У Twitter Ларэн Боберт напісала, што Джо Байдэн не змог выканаць свой канстытуцыйны абавязак па забеспячэнні бяспекі паўднёвай граніцы ЗША. Менавіта таму яна прадставіла артыкулы аб імпічменце, каб адхіліць прэзідэнта ад пасады. Паведамляецца, што на мінулым тыдні група членаў Палаты прадстаўнікоў ужо азнаёмілася з першапачаткова запытаным у ФБР дакументам у ходзе расследавання супраць Джо Байдэна, пасля чаго кангрэсвуман Марджары Тэйлар Грын ініцыявала адхіленне прэзідэнта ад пасады па працэдуры імпічменту і правядзенне расследавання.

У Канадзе назвалі цяперашнюю сітуацыю з лясныімі пажарамі найгоршай у XXI стагоддзі

Міністр па забеспячэнні гатоўнасці да надзвычайных сітуацый Канады Уільям Блэр заявіў, што цяперашняя сітуацыя з лясныімі пажарамі, якія працягваюць бушаваць у краіне, стала найгоршай з пачатку XXI стагоддзя. Аб гэтым паведаміла канадская тэлерадыёвяшчальная карпарацыя CBC. Адзначаецца, што па ўсёй краіне лясныя пажары сёлета ўжо прынеслі больш урону і катастроф, чым у іншыя гады за больш як 20-гадовы перыяд. Па словах міністра, увогуле згарэла 4,7 мільёна гектараў лесу, каля 32 тысяч канадцаў было эвакуіравана. Ён таксама звярнуў увагу на тое, што ў Канадзе цяпер назіраецца больш як 430 актыўных ачагоў узгарання, каля паловы з іх пакуль не ўзята пад кантроль пажарнымі службамі. Раней паведамлялася, што найбольш няпростая сітуацыя з лясныімі пажарамі складваецца ў правінцыях Альберта, Брытанская Калумбія, Квебек, Антарыё і Саскачаван.

Турцыя павялічыць зборы за праходжанне суднаў праз пралівы Басфор і Дарданелы

Турцыя з 1 ліпеня павялічвае зборы на 8,3 працэнта за праходжанне гандлёвых суднаў праз пралівы Басфор і Дарданелы, пошліна складзе $4,42 за тону. Аб гэтым паведаміла турэцкая газета Aydinlik. Чакаецца, што даход, атрыманы ад перасячэння праліваў, сёлета дасягне $900 млн. Сума збораў разлічваецца на аснове залатога франка, які прыраўнялі да $0,8 з часу падпісання ў 1936 годзе Канвенцыі Мантро, якая рэгулюе суднаходства ў зоне праліваў. Акрамя таго, урад Турцыі прыняў рашэнне, што залаты франк з гэтага часу не будзе фіксаваным і будзе абнаўляцца Міністэрствам транспарту і інфраструктуры ў канцы чэрвеня кожнага года па стане на 1 ліпеня. Летась у кастрычніку турэцкія ўлады ўжо павялічылі кошт збораў за праход гандлёвых суднаў праз пралівы ў пяць разоў — з $0,8 да $4,08.

Сямейная газета
Выпуск № 11 (214)

БУСЛІНАЯ ВЕРНАСЦЬ

У красавіку на нашу вясковую вуліцу нарэшце вярнуўся доўгачаканы бусел. Але чамусьці адзін, без сваёй буслiхі... «Відаць, не дажыла да вясны», — выказала сумную здагадку мая 88-гадовая суседка. Але, на шчасце, яна не спраўдзілася. Праз некалькі дзён мы ўсё ж пачулі з гнязда на слупе радасны парны клёкат...

Нашу зусім невялічкую вёсачку ўпрыгожваюць ажно дзве буслянкі. Адна месціцца побач з рэчкай на воданапорнай вежы, другая — калі мы толькі пераехалі жыць у Вусляндыю (або Вусу), знаходзілася на слупе каля паштовых скрыняў. Але дачніца, у якой птушкі «арандавалі» той слуп, відаць, была не надта задаволена такім суседствам. Пазамінулай восенню, калі «кватаранты» адляцелі ў вырай, яна папрасіла суседа разбурыць гняздо.

Ніколі не забудуся, як па вясне бусел вярнуўся дахаты і не знайшоў сваіх апартаментаў... Доўга кружыў над родным слупам, а потым, відаць, скеміў, што яму там больш не рады. І пачаў ладзіць новую «хатку» ў іншым канцы вёскі. Аблюбаваў слуп нашых суседзяў (яны якраз прадавалі дом), чаму мы былі вельмі рады, бо ўбачылі ў гэтым добры знак. А яшчэ таму, што цяпер у нас па «тэлевізары» (так мы называем сваё вялікае акно на кухні) можна глядзець не толькі сезонны серыял «Дачнікі», але і жыццё буслоў: іх шлюбныя гульні, якія пачынаюцца адразу ж пасля прылёту: як птушкі носяць галінкі і салому ў гняздо, каб падправіць жытло. Я ўжо не ўяўляю дня без буслiных канцэртаў: можна бясконца глядзець і слухаць, як грацыёзна птушкі закідваюць назад галовы — ажно да спіны — і меладычна трашчаць дзюбамі. Мой улюбёны час, калі з гнязда высоўваюцца цікаўныя галоўкі буслянят. Цікава назіраць, як яны адкрываюць дзюбкі, каб прыняць чарговага чарвячка ці змяю ад бацькоў-карміцеляў. З нецярпеннем чакаю, калі малыя пачнуць вучыцца лётаць.

Канешне, з акна — ды і нават з участка — далёка не ўсё можна разгледзець у дэталях, але я не засмучаюся. А, па парадзе свекрыві, праглядаю YouTube-канал «Гняздо буслоў», дзе анлайн можна назіраць за жыццём гэтых птушак зблізку. А ўсё дзякуючы птушкалюбам з Калугі, якія на бярозе побач з вялізнай буслянкай устанавілі прафесійную камеру і на працягу некалькіх гадоў вядуць адтуль прамую трансляцыю. Мы з задавальненнем глядзім гэтае відэа ўсёй сям'ёй. Менавіта адтуль я даведалася, што буслiная вернасць мала чым адрозніваецца ад лебядзінай. Аказваецца, белыя буслы ствараюць пару раз і назаўсёды, бо па прыродзе сваёй гэтыя птушкі манагамныя.

А не так даўно расчулілася, паглядзеўшы відэа пра сапраўдную птушыную любоў. І пра пенсіянера з Харватыі, які на працягу многіх гадоў дапамагаў гэтаму пачуццю быць. У далёкія дзевяностыя мужчына, як звычайна, выйшаў на прагулку перад сном і знайшоў на беразе ракі птушку з параненым крылом. Не раздумваючы, забраў яе з сабой, назваў Маленай (з харвацкага перакладаецца як «маленькая») і стаў выходжваць. Штодзень спецыяльна для буслiхі Сцяпан адпраўляўся на рыбалку. А калі ўбачыў, што Малена сумуе, пабудаваў ёй гняздо прама на даху свайго дома. Праз некалькі гадоў у буслянку нарэшце прыляцеў «жаніх». Птушкі радасна клекаталі і танцавалі ў гняздзе. Неўзабаве ў іх з'явіліся першыя птушаняты. Сцяпан радаваўся за наваспечаную сям'ю і дапамагаў чым мог. Але птушынае шчасце было нядоўгім: пачыналіся халады, і бусел Клепетан павінен быў на зіму ляцець у Афрыку. Малена ж ніяк не магла адправіцца з ім, бо крылы буслiхі пасля ранення не вытрымалі б працяглага пералёту. У выніку тата з дзецьмі ўсё ж адправіўся ў вырай, а Малену на зіму прытуліў у сябе дома Сцяпан. У сакавіку ж мужчына вярнуў буслiху ў гняздо. Якое было здзіўленне, калі ранняй вясной Клепетан, пераадолеўшы тысячы кіламетраў, вярнуўся да сваёй параненай сяброўкі. І рабіў гэта цэлых 17 гадоў (за гэты час у пары з'явілася 66 птушанят. У прыродзе звычайна выжывае палова патомства, а ў Малены з Клепетанам — усё, бо пракарміць дзетак буслам дапамагаў добры чалавек), ажно пакуль не памёр ад старасці.

Калі ўбачыла ў інтэрнэце гэтую кранальную гісторыю, адразу ж захацела ёй падзяліцца. Дарэчы, многія ў каментарыях пішуць, што вернасць Клепетана і Малены — цудоўны прыклад для нас, людзей, якія, ледзь што пайшло не так (я не кажу ўжо пра нейкае сур'ёзнае выпрабаванне), часта адразу гатовыя паставіць крыж на сямейных адносінах...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Тыя, хто побач

Анжаліна МІКУЛЬСКАЯ:

«Чалавеку ў жыцці патрэбна апора»

Кажуць, што маці — гузічак, на якім у сям'і ўсё трымаецца. І тут не паспрачаешся, бо ад яе настрою, умення адчуваць дамачадцаў, арыентавацца ў падзеях кожнага дня залежыць вельмі многае. Асабліва ў сучасным свеце, дзе пабудова сям'і не ўсімі ўспрымаецца як штосьці фундаментальна важнае і доўгатэрміновае. З нашай сённяшняй гераіняй — прадзюсарам, рэжысёрам, дырэктарам прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ» Анжалінай Мікульскай — мы размаўляем пра пераемнасць вопыту, выхаванне дзяцей і мінулае, якое з'яўляецца стваральнай сілай для асобы і яе будучыні.

— Анжаліна Уладзіміраўна, вы дачка ваеннага. Ці ўплываў гэты факт на ўяўленне пра будучага абранніка?

— Сапраўды, я нарадзілася і расла ў ваенным гарадку, і ў школу там хадзіла. Тата — ваенны, камандзір часці. Добра ведала, што такое і дысцыпліна, і пачуццё адказнасці. Я жыла ў асяродку, дзе ва ўсіх бацькі былі ваеннымі. Як дзіця ты прымаеш гэта за норму, і ў тваім уяўленні так выглядае свет. Ты бачыш і прыкмячаеш у мужчынах афіцэрскія якасці: адказнасць за сваё слова і выкананне таго, што паабяцаў. І я, напрыклад, сёння вельмі цаню гэта і ў працы, і ў мужчынах, і ў дзецях, бо сама ўнутрана такая ваенна-арганізаваная... Аднак тое, што здавалася лагічным пры выбары спадарожніка жыцця, для мяне не спрацавала.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Анжаліна МІКУЛЬСКАЯ *(уверсе злева)* з сям'ёй.

Бацькам на заметку

ПАМІЖ БІЗУНОМ І ПЕРНІКАМ

Як выхоўваць дзіця правільна

Калі гаворка заходзіць аб выхаванні дзяцей, адразу ж згадваецца прынцып «бізуна і перніка». «Бізун» — гэта рознага роду пакаранні, а «пернік» — пахвала і заахвочванні за добрыя паводзіны. Якія небяспекі і «падводныя камяні» падсцерагаюць прыхільнікаў жорсткага і мяккага метадаў выхавання? Пра гэта і не толькі паразважалі з дзіцячым псіхолагам Людмілай ГУБСКАЙ.



Дзве крайнасці

Давайце спачатку разбяромся, чым адрозніваецца жорсткае выхаванне ад мяккага. У кнізе Леаніда Суржэнкі «Як вырасціць сына. Кніга для разважных бацькоў» лаканічна апісваюцца плюсы і мінусы «бізуна» і «перніка».

У прыватнасці, ***жорсткае выхаванне*** — строгае, практычна дыктатарскае — патрабуе ад бацькоў мінімум творчых намаганняў і базіруецца на правілах, якія дзецям не рэкамендуецца парушаць.

1. Бацькі заўсёды маюць рацыю.

2. Тата ці мама сказалі — трэба зрабіць. Калі не згодны з загадам — спачатку выканай, потым абурайся.

3. Ёсць набор абавязкаў, якія павінен выконваць кожны член сям'і.

4. Дакладна акрэслена, што такое «добра», а што такое «дрэнна». За першае можна атрымаць цукерку. За другое — цалкам верагодна — рэменя.

Падобнае выхаванне вельмі хутка прыносіць плады. У вачах грамадства сям'я выглядае нядрэнна: дзеці паслухмяныя, прывучаныя да працы і паводзяць сябе больш-менш прыстойна.

Што дае жорсткае выхаванне?

Дакладнасць і простыя алгарытмы, што і як рабіць. Дысцыпліну і адносны парадак. Вызваляе бацькоў ад неабходнасці «ламаць галаву» над складанымі педагагічнымі праблемамі. Кантроль над паводзінамі сваіх дзяцей. Адчуванне сябе сапраўдным босам.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

З канверта

Што пасееш...

У сям'і Тоня была самай малодшай з дзяцей, яе ўсе шкадавалі і таму асабліва не прыцягвалі да хатніх спраў, у тым ліку і да прыгатавання ежы, а сама яна да гэтага і не імкнулася. Тоні нават падабалася, што яе ніхто не чапае. Ні сама яна, ні родныя не задумваліся, што ў будучыні ўсё гэта можа стаць для дзяўчыны вялікай праблемай...

Думка не арыгінальная, але актуальная: дзяцей з маленства трэба ўсяму вучыць, паказваць на сваім прыкладзе, як і што рабіць. Каб потым, калі яны ўступяць у дарослае, самастойнае жыццё, мы не здзіўляліся: у каго гэта яны пайшлі?! А таксама не зневажалі, не прыніжалі, не абражалі іх, не гаварылі, што, маўляў, рукі не з таго месца растуць... Даўно і не мною заўважана: у сем'ях, дзе выхоўваюцца некалькі дзяцей, адбываецца размеркаванне абавязкаў. Малодшыя выконваюць больш лёгкую працу, старэйшыя — цяжэйшую. І робяць яны гэта не па прымусе, а з жаданнем і ахвотай. Там практычна няма лайдакоў. Дзяўчынкі вучацца каля маці: гатаваць, мыць, шыць, прыбіраць і г. д., а хлопчыкі разам з бацькам — майстраваць, пілаваць і многае іншае. Ды і накрыць на стол, памыць посуд, зрабіць прыборку — таксама для хлопчыкаў не праблема. Такім дзецям потым будзе лягчэй жыць ва ўласных сем'ях. Жонка не скажа мужу, што ён не ўмее забіць цвік, павесіць палічку, замяніць лямпачку, а муж не папракне жонку, што яна дрэнная гаспадыня.

Ну а ў тых сем'ях, дзе дзіця песцяць, усё робяць за яго, кажучы, што «яно яшчэ маленькае і паспее напрацавацца», вырастаюць, адпаведна, беларучкі, лайдакі і няўмекі. А дарослага сына ці дачку ўжо не перарабіць, не перавучыць, не прымусіць штосьці рабіць, пакуль яны самі не захочуць. З такім мужам будзе мучыцца добрая, працавітая дзяўчына, а з няўмекайжонкай — хлопец, пра якога кажуць: «Майстар на ўсе рукі».

З-за гэтага ў сем'ях і пачынаюцца спрэчкі, скандалы ды лаянкі. А часцяком такія сын ці дачка сядзяць «на шыі» ў бацькоў гадамі, а мамы і таты пажынаюць плады «выхавання».

Каб такога не здарылася, усім бацькам, бабулям і дзядулям — чытачам «Сямейнай газеты» — мае парады:

• Прывучайце дзяцей да працы з малых гадоў.

• Давайце спачатку больш лёгкія даручэнні, а калі дзіця будзе з імі добра спраўляцца, то паступова ўскладняйце.

• Калі дзіця не хоча штосьці рабіць, зацікаўце яго ў гульнявой форме. Нават калі штосьці атрымліваецца не вельмі добра, пахваліце, падтрымайце, заахвоціце чым-небудзь, каб у яго засталося добрае ўражанне і з'явіліся цікавасць і жаданне зрабіць у другі раз лепш.

• Старайцеся не павышаць голас на дзіця, не гаварыць аб ім дрэнна ў яго прысутнасці.

• Паказвайце дзіцяці пасля зробленай справы, што вы яго вельмі любіце. І самі стаўцеся адно да аднаго з любоўю, павагай, клопатам і разуменнем. І тады ў вашых сем'ях і ў сем'ях вашых дзяцей усё будзе добра!

Таццяна Чэкед,

г. Гомель.

ПАМІЖ БІЗУНОМ І ПЕРНІКАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Якія небяспекі і падводныя камяні падсцерагаюць прыхільнікаў «бізуна»?

З часам адладжаная сістэма пакаранняў пачынае страчваць свой пагражальны патэнцыял. Для таго каб хоць неяк захаваць бачнасць парадку, прыходзіцца ўсё мацней «закручваць гайкі», узмацняць кантроль. Але рана ці позна «разьба» зрываецца. І тады бацькі сутыкаюцца з бязлітасным падлеткавым бунтам. Як правіла, вельмі жорсткае выхаванне параджае канфлікт пакаленняў, бо падтрымліваць цёплыя і даверлівыя адносіны з дзіцем, якога рэгулярна караеш, даволі складана. Акрамя таго, «бізун» забівае ініцыятыву і самастойнасць. У выніку дзіця вырастае пасрэдным выканаўцам, але ніяк не творцам.

Многія сучасныя бацькі свядома выбіраюць ***мяккі стыль выхавання***. Ён не мае на ўвазе строгі кантроль, дысцыпліну і абавязковае выкананне нейкіх правіл. Асноўныя інструменты бацькоў — угаворы, дамоўленасці, часам — подкуп («Калі ты ўвесь тыдзень будзеш мыць пасля сябе посуд, я табе куплю цацку») і прыём «цісні на жаль». У адрозненне ад жорсткага метаду тут патрэбна вялікая творчая актыўнасць бацькоў, ім даводзіцца пастаянна прыдумваць, як выйсці з той ці іншай сітуацыі.

Вельмі жорсткае выхаванне параджае канфлікт пакаленняў, бо падтрымліваць цёплыя і даверлівыя адносіны з дзіцем, якога рэгулярна караеш, даволі складана.

У мяккім выхаванні таксама ёсць свае правілы.

1. Галоўнае — інтарэсы дзіцяці. Задача бацькоў — не ўшчаміць, не пакрыўдзіць, не прыгнесці.

2. Пакараннем мы выхоўваем раба, таму — толькі ўгаворы і супрацоўніцтва.

3. Максімум свабоды і мінімум абмежаванняў.

4. Калі штосьці пайшло не так, шукайце прычыну ў сабе, а не ў дзіцяці.

5. Татальны кантроль забівае самастойнасць.

Мяккая методыка не так хутка дае вынікі. Часам здаецца, што гэта не выхаванне, а патуранне і выхаваўчая бездапаможнасць. Аднак і ў *мяккім выхаванні ёсць свае плюсы*.

Яно выхоўвае самастойнасць. Як правіла, захоўвае цёплыя і сяброўскія адносіны ў сям'і. Дазваляе вызваліць рукі ад татальнага кантролю. Практычна выключае стрэсы пакаранняў.

Галоўная слабасць мяккага выхавання ў тым, што яно разглядае практычна ўсё выключна з пазіцыі дзіцяці, улічваючы толькі яго інтарэсы. Пры такім падыходзе, калі практычна ўсё дазволена, мы атрымліваем іншую крайнасць. Як толькі спешчанае дзіця выйдзе за межы сям'і, яно сутыкнецца з забаронамі, бо іншыя людзі не дазволяць парушаць свае граніцы. У выніку малеча не будзе разумець, чаму ёй

адмовілі, чаму штосьці можа не атрымацца.

«Нельга» нам неабходна

Які тып выхавання лепшы? Думаю, большасць сучасных бацькоў скажуць: «Вядома, мяккі! Бо ўсім зразумела, што біць дзіця нельга, а загадваць — значыць забіваць ініцыятыву». Аднак не ўсё так адназначна, кажа псіхолаг. Часам самае гуманнае рашэнне можа быць адначасова і самым жорсткім. Некаторым дзецям проста неабходны цвёрдая рука, элементарны парадак і дысцыпліна.

Немагчыма выхаваць гарманічную асобу толькі метадам «перніка». Калі бацькі празмерна апякаюць і песцяць сваіх дзяцей, то апошнія вырастаюць эгаістычнымі і самаўпэўненымі, не здольнымі штосьці рабіць самастойна. Таму, як ні дзіўна, бацькоўскае «нельга» патрэбна ніколькі не менш, чым «можна». Дзіця, якому дазваляюць усё, для якога існуе толькі «можна» і «хачу», падобна на плыўца з завязанымі вачыма. Яно не бачыць берагоў, межаў. Не разумее, куды плыве і як далёка давядзецца плысці. Бацькоўскае «нельга» якраз і з'яўляецца арыенцірам: вось гэта твая тэрыторыя, твае берагі. Далей заплываць пакуль нельга. Капрызячы, не слухаючыся, парушаючы забароны, малеча насамрэч правярае маму з татам: ужо нельга ці яшчэ крыху можна? І замест дакладна акрэсленых граніц даволі часта трапляе ў балота бацькоўскіх саступак, дзе так складана намацаць неабходнае цвёрдае дно.

Калі мы караем дзяцей, самае галоўнае вось што: якім бы строгім ні было спагнанне, рабіць гэта трэба як мага больш спакойна.

«Самае горшае, — кажа Людміла Губская, — гэта калі бацькі спачатку ўсё дазваляюць свайму дзіцяці. А потым, убачыўшы, што тое «садзіцца на галаву», рэзка становяцца строгімі і патрабавальнымі. У гэтым выпадку дзіця аказваецца заложнікам сітуацыі, яму ўсё не зразумела. У выніку, як правіла, такія хлопчыкі і дзяўчынкі вырастаюць вельмі складанымі людзьмі. Больш за тое, не варта прымяняць «бізун» і «пернік» практычна адначасова. Напрыклад, спачатку пакараць і тут жа пашкадаваць і даць цукерку. Дзеці хутка прывыкаюць да гэтага і пачынаюць маніпуляваць».

Мне вельмі спадабалася, як пра важнасць «бізуна» і «перніка» сказаў святар Павел Гумераў. «Маленькі чалавек павінен з раняга дзяцінства прывучацца, што за кожнае сваё дзеянне — і добрае, і дрэннае — яму абавязкова прыйдзецца адказваць. Вось для чаго мы вучым яго шляхам пакаранняў і заахвочванняў». Менавіта таму, паводле слоў псіхолага, штосьці адкідваць катэгарычна, кідацца ў крайнасці, выхоўваць дзіця выключна жорсткімі ці выключна мяккімі метадамі — неразумна і нават небяспечна. І пакараняў, і станоўчых падмацаванняў заўсёды павінна быць у меру, толькі тады яны будуць мець патрэбны выхаваўчы эфект».

У якасці прыкладу, калі бацькі перагінаюць палку, Людміла Губская прывяла гісторыю са сваёй практыкі. «Чатырохгадовы хлопчык сядзеў на падлозе ў цэнтры пакоя і збіраў канструктар. У нейкі момант ён пераключыўся на гульню з сабакам. Пакой вялікі, праблемы абсыці той канструктар не было, але тата строга запатрабаваў, каб малы зараз жа прыбраў дэталі з падлогі. «Ну, тата, не цяпер. Я ж гуляю». Але тата быў няўхільны, узяў малога за руку, падвёў да канструктара і загадаў: «Збірай цяпер жа, я сказаў». Хлопчык падпарадкаваўся, але сабаку спыніць у гульні цяжэй, яна працягвала насіць малому цацку. У выніку дзіця, не дазбіраўшы ўсе дэталі, працягнула радасна гуляць з сабакам. Тата ж моўчкі сабраў рэшткі канструктара і выкінуў у сметнік. У малога здарылася істэрыка. Мама маўчала, не ўмешвалася, бо яна з самага пачатку не мела права голасу ў сям'і. Потым тата неаднаразова паўтарыў: «Так, я строгі і планую такім быць. Мяне так выхоўвалі і нармальным чалавекам вырас». І што вы думаеце, праз 10 гадоў гэты хлопчык уцёк з дома пасля таго, як яго з сябрамі настаўнікі злавілі з электроннай цыгарэтай і напісалі заўвагу ў дзённіку. Яго хутка знайшлі. Але неўзабаве падлетак трапіў у псіханеўралагічны дыспансер, бо не мог справіцца з хваляваннем перад здачай экзаменаў у 9 класе. Мама толькі ўздыхае: «Я нічога з гэтым не магу зрабіць. У нас вельмі строгі тата, таму сын нічога не хоча расказваць». Хоць у той сітуацыі з канструктарам многае залежала менавіта ад мамы. Калі б яна, укладваючы спаць сына, сказала: «Давай наступны раз я шапну табе, што тата пачынае злавацца, і ты ўсё ж такі выканаеш яго просьбу, гэта важна», — то ўсё было б гарманічна і хлопчык прыходзіў бы да мамы са шчырымі размовамі, пытаўся парады. Бо калі дзеці шукаюць дапамогі на баку — гэта заўсёды сумна. Ці мала што ім параяць! Менавіта бацькі павінны быць такім неабходным тылам, падтрымкай для сваіх дзяцей».

Не забывайце хваліць

Наогул, лічыцца, што класічнае выхаванне стаіць на «трох кітах»: бізун, пернік і асабісты прыклад (недарэмна кажуць: перастаньце выхоўваць дзяцей — яны ўсё адно вас капіруюць, пачніце з сябе). «Варта дадаць, што ўсе гэтыя тры кампаненты павінны быць злучаны з любоўю, — працягвае псіхолаг. — Таму, перш чым пакараць, папярэдзьце малога, што вам не падабаюцца яго дзеянні, і, калі ён не спыніцца, то вы будзеце вымушаны прыняць меры. Калі мы караем дзяцей, самае галоўнае вось што: якім бы строгім ні было спагнанне, рабіць гэта трэба як мага больш спакойна. У вачах бацькоў не павінна быць гневу, а толькі строгасць і яснае выказванне свайго патрабавання. Важна данесці да дзіцяці, што вы па-ранейшаму яго любіце, але не можаце абыякава прайсці міма яго дрэнных учынкаў. Што караеце не з-за асабістай непрыязнасці, а таму што хочаце дапамагчы яму стаць лепшым. І ставіцеся дрэнна не да яго, а да яго дрэннага ўчынку. Пазбягайце слоў «ты як заўсёды», «ты ніколі». І яшчэ вельмі важна, каб пакаранне было адэкватным учынку (не трэба за непаднятую абгортку ад цукеркі пазбаўляць паходу ў кіно ці не пускаць на вуліцу) і не залежала ад настрою бацькоў. Абавязкова патлумачце, за што вы яго пакаралі. Важна ў канцы размовы выдаваць «інструмент»: як трэба было выйсці з гэтай сітуацыі. Каб дзіця захацела пераацаніць свае дзеянні і наступны раз зрабіла па-іншаму».

Дзіцяці ў любым узросце неабходна добрае слова, пахвала, адабрэнне. У гэтым выпадку ў яго ствараецца і падмацоўваецца пазітыўнае ўспрыманне сябе

Дарэчы, звярніце ўвагу, што дзеці-дашкольнікі, амаль не задумваючыся, згадваюць сітуацыі, у якіх на іх сварыліся, расказваюць, як менавіта іх караюць. А вось пытанне «За што мама цябе хваліць?» ставіць іх у тупік. Гэтае маё назіранне пацвярджае статыстыка. Каля 40 % дзяцей 5-6 гадоў не могуць успомніць такую сітуацыю, а яшчэ прыкладна 40 % кажуць, што, каб згадаць пахвалу, патрабуецца час, і толькі 20 % адказваюць, што іх хваляць часта. Першыя 40 % вызначаюцца няўпэўненасцю ў сабе і нярэдка або агрэсіўныя, або, наадварот, замкнёныя. А вось тыя 20 % дзяцей, бацькі якіх спалучаюць частую пахвалу з вымовай, актыўныя, валодаюць адэкватнай самаацэнкай, упэўненыя ва ўласных сілах. Гэта яшчэ раз пацвярджае, наколькі важна ўсё ж такі спалучаць пакаранні з заахвочваннямі. Добрай прапорцыяй, на думку псіхолагаў, будзе 30 % асуджэнняў і пакараняў і 70 % пазітыўнай «зваротнай сувязі». Дзіцяці ў любым узросце неабходна добрае слова, пахвала, адабрэнне. У гэтым выпадку ў яго ствараецца і падмацоўваецца пазітыўнае ўспрыманне сябе, дзіця само імкнецца паводзіць сябе так, каб гэты станоўчы вобраз падтрымліваць. Таму часцей звяртайце ўвагу на лепшыя праявы ў дзіцячых паводзінах, і «бізун» давядзецца «даставаць» досыць рэдка. А свядомых, добрых учынкаў стане значна больш!

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Здымаем маскі!

Выйсці замуж за прынца

Пра каханне, развод ды «шлюбных аферыстаў» новай фармацыі

Не, гаворка пойдзе не пра скасаванне шлюбу і не пра тое, «чаму памірае каханне». Наадварот, размова пра тых, хто гэтае каханне хоча знайсці. Сёння людзі амаль не знаёмяцца на вуліцах, у кіно і парках. Магчымасць наладзіць асабістае жыццё (асабліва калі маюцца на ўвазе не «юныя сэрцы», а людзі ва ўзросце 30+) у трэцім тысячагоддзі практычна цалкам сышла ў анлайн.
І ў гэтым ёсць як станоўчыя бакі, так і значныя мінусы. Бо незразумела, хто насамрэч знаходзіцца па той бок манітора. А значыць, у пошуках асабістага шчасця можна стаць ахвярай махляра.

У сетках хлусні

Нядаўна здабыткам грамадскасці стала гісторыя, якая, як можна меркаваць па каментарыях, моцна павесяліла некаторых чытачоў парталаў навін. Хоць насамрэч гісторыя сумная. Дама сярэдняга ўзросту, жыхарка Баранавічаў, пазнаёмілася ў сацыяльных сетках з мужчынам. Той адрэкамендаваўся ёй прынцам з Арабскіх Эміратаў. Зразумела, «прынц» неўзабаве «закахаўся» ў сваю «выпадковую знаёмую» з далёкай Беларусі і з усходнім запалам хутка прыняў рашэнне пабрацца шлюбам з ёй. Але, каб выйсці замуж за прынца, жанчыне спачатку трэба было «набыць каралеўскую карту ААЭ для пражывання ў краіне і карыстання выгодамі каралеўскай сям'і». Каштавала гэта крыху больш за 6500 беларускіх рублёў. Але што такое грошы ў параўнанні з той чароўнай будучыняй, якая адкрывалася перад ёй! Далей спатрэбіліся сродкі на атрыманне дазволу на пералёт асабістага самалёта арабскага прынца ў Мінск, а таксама на падарункі ад нявесты старэйшынам прынцавага роду. Агулам жанчына пералічыла каханаму каля 192 000 рублёў — яна прадала свой дом. У рэшце рэшт, пераканаўшыся, што ў «каханай» больш нічога няма, «прынц» папросту знік у невядомым напрамку. Нейкі час жанчына беспаспяхова спрабавала з ім звязацца, а потым нарэшце зразумела, што стала ахвярай «разводу». Звярнулася ў міліцыю. І высветлілася, што каханага яна не толькі ніколі не бачыла нават на відэа, але і голасу яго не чула — ні разу не размаўляла з «прынцам» нават па аўдыясувязі.

Каментарыі навіны розныя. Шмат насмешлівых. Хоць смяяцца на самай справе няма з чаго — варта задумацца аб адзіноце і асабістай неўладкаванасці многіх нашых жанчын. Бо гераіні гэтай гісторыі настолькі не хапае душэўнай цеплыні, што яна гатовая паверыць нават «арабскаму прынцу» з сацсетак і яго немудрагелістай хлусні.

Яшчэ больш свежая і вельмі падобная гісторыя. Праўда, грошы там больш сціплыя, ды і ў галоўнай ролі — мужчына, а не жанчына. Саракавасьмігадовы жыхар сталіцы сустрэў на сайце знаёмстваў маладую прыгожую дзяўчыну. Навошта жанаты чалавек (як высветлілася пазней, пацярпелы — муж і бацька сямейства) рэгістраваўся на сайце знаёмстваў, пакінем за дужкамі. Дзяўчына, дарэчы, таксама мае траіх дзяцей і ў момант «віртуальнага рамана» знаходзілася ў адпачынку па доглядзе свайго малодшага, якому яшчэ не споўнілася трох гадоў. Зразумела, на свой сапраўдны статус і абставіны жыцця абое фігуранты адно аднаму вочы не адкрылі. Яны фліртавалі і размаўлялі, дзяўчына прасіла невялікія сумы на розныя дробязі, мужчына з задавальненнем праяўляў шчодрасць. Ну, а потым яна, як водзіцца, захацела прыехаць у Мінск для асабістай сустрэчы і папрасіла аплаціць дарогу. Ехаць дзяўчына са свайго аграгарадка ў сталіцу вырашыла, верагодна, на таксі, таму што папрасіла ў каханага 400 рублёў. Той зрабіў шырокі жэст і перавёў ёй грошы. Чакаў-чакаў прыезду каханай, але не дачакаўся. Дзяўчына ж не губляла часу дарма. З чужога акаўнта яна зайшла ў сацсеткі, дзе па фота знайшла мужчыну і даведалася, што ў яго ёсць законная жонка і дзеці. Далей у ход пайшоў шантаж. Словам, у фінале гэтай гісторыі пацярпелы таксама адправіўся ў міліцыю. Калі махлярку затрымалі, яна сказала, што хацела такім чынам паправіць сваё матэрыяльнае становішча.

Па той бок манітора

Ахвярамі «марадзёраў любоўнага фронту» становяцца і мужчыны, і жанчыны. Хоць менавіта жанчыны (як правіла, сярэдніх гадоў, якія часта раней былі ў няўдалым шлюбе і павінны былі, здавалася б, ужо набрацца жыццёвага вопыту) часцей трапляюцца на хітрыкі шлюбных аферыстаў у сацсетках, каментуе **сямейны псіхолаг Кацярына АЛЁХІНА**. Але — цікавая дэталь: нават пасля таго, як іх ашабралі да ніткі, здараецца, пацярпелыя ўздыхаюць: «А ўсё ж такі гэты віртуальны раман быў найлепшым у маім жыцці!»

Шлюбныя аферысты нашых дзён не заўсёды «працуюць» у адзіночку: цалкам можа быць, што любоўныя пасланні даверлівай «Джульеце» складае цэлая каманда — па зменах. Сакрэт іх абаяння — у веданні псіхалогіі. Хоць сцэнарыяў спакушэння

не надта шмат, ашуканцы вар'іруюць іх, адаптуючы пад кожную патэнцыяльную «нявесту»: уліваецца ўзрост, захапленні і хобі, прафесійныя інтарэсы і тыя звесткі пра мінулае жыццё жанчыны, якія атрымліваецца сабраць у сацсетках. Калі жанчына адна выхоўвае дзіця, мужчына паўстане верным, надзейным, забяспечаным і схільным да таго, каб стаць добрым сем'янінам — «гатовы бацька» для яе малога. Калі паненка паспяховая ў прафесіі — ашуканец раскажа пра свае бізнес-поспехі, а таксама пра нерухомасць у яго ўласнасці і нядаўні адпачынак на Багамах. Адзінокім жанчынам, якія адчуваюць патрэбу падарыць камусьці сваё цяпло, прадставяць вобраз кранальна закаханага ў яе юнака, а тым, хто шукае заступніцтва і чакае «моцнае плячо» і «каменную сцяну», пакажуць маску «сапраўднага палкоўніка».

Насамрэч, распавядаюць псіхолагі, «масак» не так і шмат, але ж і сюжэтаў ва ўсёй сусветнай літаратуры ўсяго некалькі дзясяткаў. Ашуканцы, як правіла, абыходзяцца некалькімі «вобразамі». *«Рамантычны герой»* гадзінамі гутарыць з жанчынай пра яе саму — яе непаўторную прыгажосць і багаты ўнутраны свет. А таксама пра тое, як доўга ён яе шукаў і якім нялёгкім і поўным расчараванняў быў яго шлях, але яна вярнула яму веру ў чалавецтва. *«Слаўны хлопец»* эксплуатуе гісторыю, як сумленнаму, працавітаму і вельмі добраму чалавеку проста не шанцуе ў жыцці. Тут, як правіла, фігуруюць хворая мама, дзіця-інвалід ад першага шлюбу і іншыя цяжкасці, з якімі мужчына спраўляецца сам, сціснуўшы зубы і не скардзячыся. Але цяпер яго новая знаёмая асвятліла нарэшце яго нялёгкае жыццё промнем кахання... *«Сапраўдны палкоўнік»*, супермен і бэтмен у адной асобе — таксама распаўсюджаная маска шлюбнага аферыста. Лётчык, герой-падводнік, капітан далёкага плавання — словам, мужчына з вялікай літары, сур'ёзны і мужны. Ён «не ведае слоў любові», але за яго скупымі пасланнямі можна разгледзець сэрца, поўнае кахання. І, зразумела, лідзіруе *«прынц на белым кані»* — арабскі ці яшчэ які-небудзь. Бо гісторыя пра Папялушку і сёння самая запатрабаваная і ў аўтараў «жаночых раманаў», і ў стваральнікаў рамантычных серыялаў.

Дзеля справядлівасці дададзім, што анлайн-аферысткі, якія вымагаюць грошы ў мужчын, наогул абыходзяцца, як правіла, усяго адным «вобразам» — вясёлая шукальніца прыгод, згодная на ўсё без якіх-небудзь абавязацельстваў: з ёй дакладна не будзе сумна. Яна абяцае зрабіць жыццё мужчыны непаўторнай прыгодай — і сапраўды, прыгоды для яго неўзабаве пачнуцца. Толькі ён наўрад ці ім узрадуецца.

Ад флірту да шантажу

Калі вас здзівіла, што са сваім арабскім венцаносцам «будучая прынцэса» ніколі нават не размаўляла, толькі перапісвалася — не здзіўляйцеся. Распаўсюджаная стратэгія ашуканцаў у інтэрнэце — заставацца максімальна «віртуальнымі»: гэта дазваляе кожнай ахвяры дадаць у вобраз каханага патрэбныя ёй дэталі і ўскладняе ў далейшым пошук махляра праваахоўнікамі. На піку бурнага віртуальнага рамана ў выбранніка непазбежна «ўзнікаюць праблемы», і жанчына, што падсвядома ўжо лічыць гэтага мужчыну блізкім чалавекам, зразумела, працягвае руку дапамогі. Матэрыяльнай. Прадстаўнікі праваахоўных органаў могуць расказаць нямала такіх «гісторый кахання» і іх зусім не рамантычнага працягу.

Акрамя прамых просьбаў да «каханай»/«каханага» аб матэрыяльнай дапамозе — на лячэнне раптоўнай хваробы; на тое, каб прыехаць да яе/яго і, нарэшце, уз'яднацца і г. д. — ашуканцы выкарыстоўваюць яшчэ цэлы шэраг распаўсюджаных схем. І хоць пра схемы гэтыя пісалі ўжо не раз і не два, людзі працягваюць «заглынаць прынаду». Напрыклад, становяцца ахвярамі банальнага шантажу. Махляр, увайшоўшы ў давер, прапануе абмяняцца фота рознай ступені інтымнасці — у залежнасці ад ступені разняволенасці ахвяры. Або, размаўляючы па відэасувязі (яго камера, хутчэй за ўсё, «выпадкова» аказваецца зламаная), просіць зняць вопратку. Пасля гэтага паведамляе, што фота і відэа трапяць у інтэрнэт, калі не адправіць на яго рахунак пэўную суму. І пацярпелыя плацяць, а ашуканцы працягваюць «даіць» іх яшчэ доўгі час — пакуль ахвяра махлярства не вырашыцца ўсё ж (нягледзячы на тое, што распавядаць каму б там ні было пра падобныя эпізоды сорамна і цяжка) напісаць заяву ў міліцыю.

Яшчэ адна схема мае на ўвазе перадачу «каханаму» кода з смс або нават банкаўскіх рэквізітаў вашай карты. З серыі: «Замовіў табе падарунак, але не прыходзіць код. Напэўна, назваў выпадкова твой нумар замест свайго — я ж увесь час пра цябе думаю. Прадыктуеш код?» Далей вашы грошы сплываюць у рукі ашуканцаў. А здараецца, з якой-небудзь падобнай нагоды людзі паведамляюць «віртуальным умілаваным» рэквізіты сваіх банкаўскіх карт. Дарэчы, існуюць яшчэ і падробныя сайты знаёмстваў, якія выкарыстоўваюцца для збору інфармацыі аб зарэгістраваных на іх людзях. Пры рэгістрацыі на такіх сайтах можа быць прапанавана запоўніць анкету з пытаннямі, аналагічнымі тым, што выкарыстоўваюцца для банкаўскіх аперацый.

Дзіяна РОНІНА.

Меры засцярогі

Дык што рабіць? Бегчы ад сайтаў знаёмстваў як ад агню? У першую чаргу — уключыце здаровы сэнс. Нядобрыя «званочкі», якія павінны вас насцярожыць:

• Калі ваш новы знаёмы (знаёмая) занадта настойлівы і напорыста імкнецца збліжацца з вамі. Пра сябе не распавядае нічога — уключаючы адрас і тэлефон, а вось вас распытвае вельмі падрабязна.

• Праз некалькі дзён пасля знаёмства клянецца ў каханні і збіраецца давесці справу да шлюбу. Пры гэтым адмаўляецца ад тэлефонных размоў і зносін па відэасувязі.

• Зразумела, насцярожыцца трэба, калі віртуальны знаёмы просіць у вас грошы: маўляў, прадавай машыну/кватэру/дом, у нашай агульнай будучыні купім лепшыя.

• Калі абяцае зорку з неба і горы золата, але вось няўдача — толькі што ён згубіў сваю банкаўскую карту, трапіў у аварыю або паўсталі іншыя праблемы. І, само сабой, ён разлічвае на вашу матэрыяльную дапамогу.

І яшчэ некалькі парад:

Памятайце, што вашы фотаздымкі (прычым не толькі тыя, што маюць нейкі інтымны змест) — гэта асабістая інфармацыя, да якой варта ставіцца беражліва. Рассыласць яе выпадковым знаёмым нельга.

Рэгіструючыся на сайтах знаёмстваў, падключыце для гэтага асобную сім-карту. Яна не будзе прывязаная да вашай банкаўскай карты.

І самае галоўнае: нікому не паведамляйце інфармацыю, якую можна выкарыстоўваць для доступу да вашых фінансавых і асабістых даных. І не спяшайцеся адкрываць свой кашалёк, якім бы закаханым ні здаваўся «арабскі прынц».

Летнія прыгоды



ТУРНІР — СПРАВА СУР'ЁЗНАЯ

«Бітва за Мір» і званне князёў вострава Тартуга — у Мірскім замку прайшлі адмысловы квэст і яхтавая рэгата

Новыя князі таямнічага вострава Тартуга, які знаходзіцца недзе ў акіяне, былі каранаваныя на выхадных... у Мірскім замку, дзе адбылася «Бітва за Мір» — турнір, па выніках якога і вызначыліся найлепшыя правіцелі, якія цяпер будуць захоўваць незлічоныя скарбы вострава. Падобны квэст, які завяршыўся рэгатай радыёкіраваных мадэляў яхт «Адзін вецер для ўсіх» на замкавым возеры, тут ладзілі ўпершыню.

Кароны — ва ўдзельнікаў з Оршы

Найвышэйшая задача правіцеляў вострава — захоўваць праўдзівую гісторыю і сваім прыкладам дэманстраваць узор мужнасці, прыстойнасці і любові да роднай зямлі. І цяпер гэта задача ляжа на плечы новых князёў — пераможцаў адмысловага квэсту, у якім удзельнічалі 14 дзяцей.

— Мы ўжо крыху стаміліся і вырашылі, што наспеў час перадаць кароны камусьці з вас, таму вы павінны прайсці выпрабаванні, каб стаць новымі правіцелямі, — такі наказ далі ўдзельнікам турніру цяпер ужо былыя князь і княгіня, распачынаючы турнір. — Вам давядзецца праявіць адвагу і мужнасць, кемлівасць і спрытнасць. А ў працэсе яшчэ і збіраць манеты, папаўняючы скарбніцу княства.

Удзельнікаў папярэдзілі, што турнір — справа сур'ёзная, таму за падказкі ад бацькоў змагары за карону будуць штрафавацца. Затое падказкі можна набыць за манеты. На шляху выпрабаванняў малых чакалі гістарычныя персанажы і галаваломкі ўнутры і звонку замка, а арыенцірам на шляху да перамогі служылі выявы карон.

11 заданняў турніру былі самыя розныя: падлічыць вежы замка, напісаць назву прадмету ў малюнках, дамаляваць карціну, прадэманстраваць меткасць і ўменне запамінаць.

Пераможцам турніру сярод хлопчыкаў стаў 13-гадовы **Глеб МАРКАЧЭЎСКІ** з Оршы, які атрымаў карону і быў прызначаны першым новым князем вострава. Хлопчык расказаў, што для яго гэта хвалюючая падзея.

— Мы спецыяльна прыехалі паўдзельнічаць у турніры і паглядзець замак, дзе я ніколі не быў. Потым будуць і іншыя князі, удзельнікі квэсту, але я першы.

Новая княгіня — 9-гадовая **Ульяна ЕРМАЧЭНКА** — таксама прыехала з Оршы і ў Мірскім замку ўпершыню. Яна лічыць, што заданні турніру былі не толькі на веды, але і «на ўдачу» — пашанцуе адшукаць і здагадацца, як выканаць задачу, ці не.

— Ехалі спецыяльна на турнір, і падчас спаборніцтваў я ніводнай манеты не патраціла, усё зрабіла сама. Цяпер адчуваю, што я ўжо не звычайная дзяўчынка, а асаблівая — першая новая княгіня!

Цікава, што «князь» і «княгіня» вучацца ў адной школе, але паміж сабой да «каранацыі» не былі знаёмыя. Цяпер ім давядзецца наладжваць стасункі, каб разам упраўляць вострава да таго часу, пакуль не з'явяцца новыя правіцелі Тартугі. І першым княжацкім указам стала правядзенне рэгаты на возеры.

Мадэлі вельмі зручныя для дзяцей, бо важаць каля кілаграма, і ім не патрэбны дадатковыя сродкі для транспарціроўкі.

Адзіны вецер для ўсіх

У плаванне адправіліся пяць адважных капітанаў — гадаванцаў мінскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы па водных відах спорту. Радыёкіраваныя судны выправіліся ў воднае падарожжа пад моцным ветрам, які нахіляў мадэлі і намагаўся збіць з курсу. Адна яхта нават не здолела дайсці да фінішу — настолькі складанымі аказаліся выпрабаванні прыроды.

Аднак юныя капітаны змагаліся заўзята і імкнуліся прайсці абазначаны маршрут без памылак. Дзвюм яхтам нават прыйшлося счапіцца на вадзе ў незапланаваным «падыбцы». Самым спрытным і ўдачлівым стаў **Кірыл ЛУК'ЯНЕНКА**, які атрымаў кубак чэмпіёна вострава Тартуга з прысваенням тытула найлепшага капітана 2023 года з рук князя Глеба і княгіні Ульяны.

— Я займаюся толькі пару месяцаў, і мадэлі мы робім самі. Было цяжка з-за ветру, але ж напрадзе яшчэ шмат выпрабаванняў, — падзяліўся ўражаннямі найлепшы капітан.

Пры такім моцным ветры дзеці яшчэ ні разу не запускалі яхты, таму гэта сапраўды было складана, пацвердзіў **Юрый ЕРМАКОЎ**, трэнер-выкладчык дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы па водных відах спорту:

— Усе сённяшнія капітаны займаюцца ўсяго некалькі месяцаў. Цяпер яны ў спартыўным лагеры штодня трэніруюцца на Камсамольскім возеры. Сёлета гэтыя мадэлі бадай што ўпершыню былі спушчаны на ваду, і гэта наш праект, які можна лічыць найлепшым на прасторы былога СССР. Да кожнага тыпу ветру трэба рыхтаваць свае ветразі. А на яхтах цяпер камплект ветразяў, які не разлічаны пад такі моцны вецер, таму дзеці ўдвая малайцы, што справіліся.

Мадэлі, якія ўдзельнічалі ў рэгаце, — міжнароднага класа RG65, і ў свеце праходзяць чэмпіянаты з гэтым класам суднаў. Хоць у Беларусі такі кірунак пакуль не вельмі развіты, мадэлі вельмі зручныя для дзяцей, бо важаць каля кілаграма, і ім не патрэбны дадатковыя сродкі для транспарціроўкі. Да таго ж яхта мае добрыя хадавыя якасці.

Скончыліся ўрачыстасці і спаборніцтвы выступленнем удзельнікаў клуба гістарычнай рэканструкцыі «Шатландская пяхота», якія з'яўляюцца асабістай гвардыяй Мірскага замка.

Ірына СІДАРОК,
фота аўтара.

Здзіўляць і задавальняць

Турнір «Бітва за Мір» і рэгата на возеры сталі пробным крокам на шляху далейшага ўдасканалення «разыначак» і прапануемых прыгод у Мірскім замку і развіцця сучасных тэхналогій. Налета на возера спусцяць дзевяць палепшаных копій судна «Чорная жамчужына» з фільма «Піраты Карыбскага мора». Мадэлі выраблены ў маштабе 1:36 Уладзімірам Шэндаравым, апантаным энтузіястам, які з'яўляецца таксама аўтарам праекта «Бітва за Мір». І гэта будзе ўжо сапраўдная рэгата, паабяцаў **Аляксандр ЛОЙКА, дырэктар музея «Замкавы комплекс «Мір»**:

— Гэтыя радыёкіруемыя караблі ўдасканаленыя ў тым сэнсе, што на іх можна выходзіць на ваду нават праз інтэрнэт (з сайта Tortuga.by) з любога пункта свету і пры тым анлайн бачыць рух карабля. Так што ў перспектыве мы, думаю, зробім і міжнародныя гонкі сусветнага ўзроўню. Наш комплекс займае 26 гектараў, кожны з якіх мы стараемся асвоіць так, каб было цікава наведвальнікам. Каб турыст заставаўся тут не на паўдня, каб бавіў час, гледзячы на мерапрыемствы, што ў нас адбываюцца. Турнір «Бітва за Мір» таксама стаў адметным спаборніцтвам на гістарычную тэму, дадаўшыся да іншых цікавінак, якія мы ладзім, каб здзіўляць і задавальняць турыстаў.

На гэтых выхадных, дарэчы, у Мірскім замку пройдзе чарговае мерапрыемства — «Музычныя вечарыны».

«Чалавеку ў жыцці патрэбна апора»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Дзе і пры якіх абставінах вы пазнаёміліся з будучым мужам?

— Мы разам вучыліся ў Санкт-Пецярбургскім эканамічным універсітэце, але пазнаёміліся па творчай лініі. Там у нас быў творчы альянс, дзе мы выступалі, арганізоўвалі розныя мерапрыемствы. Так усё і пачалося. Будучы муж працяглы час быў шыкоўным сябрам. У працы я магла заўсёды і ва ўсім на яго разлічваць. Ведала, што нават пасярод ночы ён прыедзе і дапаможа, калі спатрэбіцца. А пасля ў нейкі момант ты ўсведамляеш, што ўжо не можаш без гэтага чалавека. Мужу я вельмі ўдзячная за тое, як ён (хоць і быў закаханы) тактоўна і паважліва ставіўся да мяне, бо баяўся, што калі адкрыецца, то мы страцім дружбу. Калі ён прызнаўся ў пачуццях і сказаў пра жаданне стварыць сям'ю, быць разам назаўсёды, то я... задумалася. Бо, ведаеце, бываюць мімалётныя захапленні, а калі мужчына бачыць вас і ў фінале свайго жыцця побач — гэта вельмі каштоўна. Пасля ўжо ў Рэмарка прачытала, што «каханне — гэта калі хочаш з кімсьці састарыцца».

— Чым вы да гэтага часу захапляецеся ў сваёй «палавіне»?

— Ён — цудоўны бацька. Я ўдзячная лёсу за тое, што ў маіх дзяцей такі тата, які не проста іх любіць, а выхоўвае, думае пра іх будучыню — хоць кніжку з яго пішы. Муж заўсёды ў курсе спраў сына і дачкі, гатовы ў любы момант прыйсці ім на дапамогу. Помню, як наша 7-гадовая Сафія першы раз пайшла сама ў краму. Вядома, усе хваляваліся, але тата больш за ўсіх. І для мяне такое яго стаўленне да дзяцей вельмі шмат значыць. І мяне ён абараняе. Калі са мной размаўляюць людзі, муж назірае за тым, як гэта робіцца. А па вуліцы іду побач з ім — адчуванне такое, нібы я ў яго руках.

— Лічыцца, што мадэль для пабудовы ўласнай сям'і мы пераймаем ад бацькоў. Што вы ўзялі ад таты і мамы?

— Я сваіх бацькоў вельмі люблю, яны ў мяне ўжо ў паважаным узросце. Я іх вучаніца, а яны для мяне прыклад. Самае галоўнае ў выхаванні дзяцей — не словы, а наша дзейнасць, прыклад, які бачыць сын ці дачка. Як размаўляюць мама з татам, як вырашаюць праблемы — вось адпраўныя пункты для дзіцяці. Мой тата быў прыкладам таго, што мужчына нясе адказнасць за свае словы, за зладжанасць дзеянняў, дае любоў і клапоціцца пра сям'ю. Ад яго я пачула шмат парад, якіх прытрымліваюся і сёння. Напрыклад, калі я села за руль, ён мне сказаў: ніколі не марудзь на дарозе, вырашыла ехаць — едзь. А калі я выйшла на работу, то бацька мне параіў перш за ўсё выконваць даручэнні старэйшага па ўзросце і начальніка — тады ўсе справы зрабіць паспееш.

Мама — мая душа. Яна ў мяне была завучам у школе, а пасля ў каледжы. Ад яе я спасцігала навуку жыцця адносна таго, як павінна паводзіць сябе жанчына. Маці вучыла апранацца, ствараць настрой у сям'і, выбудоўваць адносіны са сваім асяроддзем. І самае галоўнае, што мае бацькі — людзі з пачуццём гумару. Уменне жартаваць — надзвычай важная рэч у сям'і: калі яго няма, то будзе няпроста.

З сынам Германам і дачкой Сафіяй.

«Нам з мужам хочацца даць дзецям адчуванне, што мы ўсе ёсць адно ў аднаго, што мы разам, нягледзячы на адлегласць».

— А якія традыцыі ёсць у вашай сям'і і як зберагаеце памяць аб продках?

— У 2000 годзе я пачала займацца вывучэннем сваёй радаслоўнай. Працэс гэты вельмі павольны. Я проста сутыкнулася з тым, што ў сем'ях не захоўваецца больш інфармацыі, чым аб прабабулях і прадзядулях. Такой тэмай у нас не прынята цікавіцца і няма адпаведнага інстытута. На мой погляд, вялікая праблема, што мы не ведаем свайго роду. Таму я задалася мэтай даведацца больш пра сваіх родзічаў, пачала распытваць бацькоў, бабулю. Пайшло вывучэнне альбомаў, фотаздымкаў. Мяне вельмі захапіў працэс пошукаў. Вывучаць радавод вельмі цікава, бо ты такім чынам вывучаеш сябе. На сёння я ведаю каля 400 сваіх родзічаў.

— Цяжка даецца «знаёмства» са сваякамі?

— Так адбываецца з усімі, хто знаёміцца са сваім родам. Ты бачыш фотаздымкі людзей, даведваешся пра іх інфармацыю і разумееш, што яны, твае родныя, вось такія. Я адчувала, нібы мне на плечы ўпала вялікая граніт-ная пліта і мне трэба яе падняць. А далей адбываецца ўсведамленне таго, колькі людзей з розных стагоддзяў (у мяне радаслоўная да 1735 года) з цікавымі лёсамі і імёнамі жылі да цябе. Ты чытаеш дакументы і дазнаешся, што адзін прайшоў вайну, у другога нешта было з дзіцем, трэцяга расстралялі... І кожны з іх за табой, а ты цяпер быццам іх флагман. У нечым яны твае дапаможнікі, а ў чымсьці ты павінна іх не падвесці, абараніць. Мне падабаецца мой род, у мяне там усе моцныя, працавітыя.

— Вы двойчы мама. Выхоўваць сына і дачку — наколькі і ў чым гэта розныя вопыты для бацькоў, і ў прыватнасці для мамы?

Анжаліна МІКУЛЬСКАЯ *(справа)* з сям'ёй.

— Вопыты вельмі розныя, асабліва калі першынец — хлопчык. Да нараджэння сына я жыла ў сваім дзявочым свеце, а потым нарадзіўся ён. Вядома, можна кніжкі чытаць, вывучаць псіхалогію мужчын, але як выхоўваць менавіта гэтага маленькага чалавека, ты не ведаеш. Таму тут важны ўклад таты, які лепш разумее, як знайсці падыход да хлопчыка. Аднак у мамы свая роля. Мне пашчасціла з Германам — сын у мяне рос «па кніжцы». А вось з дачкой Сафіяй ужо зусім па-іншаму ўсё складвалася. У выхаванні сына я абапіралася на ўласнае ўяўленне пра ідэальнага мужчыну. Мне важна, каб ён быў акуратным, разумным і г. д. Ужо ад гэтага і адштурхоўвалася. Напрыклад, я хачу, каб сын адстойваў уласнае меркаванне. А мяне выклікаюць у школу, бо Герман... дазволіў сабе паправіць настаўніка, калі той назваў няправільную дату. Я еду і думаю, як мне паводзіць сябе. З аднаго боку, мне не падабаецца, калі на настаўнікаў нападаюць, бо я пераканана, што любыя праблемы можна вырашыць у дыялогу. Але я не павінна дазволіць прынізіць і майго сына. Выслухала абодва бакі, папрасіла прабачэння, але папярэдзіла настаўніцу, што Герман і надалей будзе адстойваць сваё меркаванне, калі ўпэўнены ў сваіх ведах, і я гэта ў ім паважаю. Для сябе я зрабіла выснову, што заўсёды важна разбірацца ў сітуацыі, але з улікам будучыні. Я супраць, каб на дзіця крычалі, бо ў выніку можа вырасці мужчына, які будзе цярпець такое ж стаўленне з боку начальніка, жонкі, суседа. Дзіця заўсёды будзе вам удзячнае, калі бачыць, што вы яго падтрымліваеце і паважаеце як асобу. З моманту нараджэння дзіця ўсё разумее.

З дачкой было прасцей. Яна ў мяне дзяўчынка, якой уласціва і клапатлівасць, і жаноцкасць, і пяшчота, і какецтва. У гэтым, праўда, вялікая заслуга маёй мамы. Сафія заўсёды глядзіць на сітуацыю з розных бакоў, хутка арыентуецца, умее слухаць. Некалькі разоў яна трапляла да мяне на праекты, і вось там яна — ідэальны памочнік.

— Вы перыядычна вандруеце са сваімі дзецьмі. Як заставацца з імі на адной хвалі па меры таго, як яны становяцца дарослымі?

— Проста павінна быць штодзённая камунікацыя з імі. Мне даводзілася неяк тлумачыць сыну і дачцэ, што такі падыход вельмі важны, каб адчуваць сябе ўпэўнена на жыцці. Я сама кожны вечар размаўляю з мамай. Трэба гаварыць, дзяліцца навінамі, раіцца. А калі людзі робяць у сваёй камунікацыі працяглыя паўзы, то яны абрастаюць такой колькасцю спраў, якія пасля ўжо і не перакажаш. А ў выніку пачынае расці дыстанцыя паміж імі. Я не кажу пра размовы па тэлефоне гадзінамі. Дастаткова проста пажадаць адно аднаму добрага дня альбо спытаць парады ў нейкай тэме. Але задаць тон і пабудаваць такую сувязь паміж усімі людзьмі ў сям'і — задача мамы. І падтрымліваць такі фармат важна незалежна ад таго, наколькі вы стомленыя ці занятыя. Зразумела, мае сын і дачка дарослыя і многія пытанні вырашаюць самастойна. Аднак нам з мужам хочацца даць дзецям адчуванне, што мы ўсе ёсць адно ў аднаго, што мы разам, нягледзячы на адлегласць. Чалавеку патрэбна ў жыцці апора ў выглядзе бацькоў, дома, душэўнай сувязі з роднымі. А калі такой няма, то варта яе ствараць.

— Хто ў сям'і павінен быць для жанчыны на першым месцы: муж, дзеці ці яна сама?

— На першым месцы павінен быць муж, а ў галаве — дзеці. Але гэта не значыць, што сама ты павінна стаць незаўважнай. Проста вельмі важна будаваць адносіны ў сям'і так, каб усе разумелі, што тата ў вас галоўны. Калі мужчына адказны за сям'ю, прымае рашэнні, то гэта правільная мадэль на будучыню для сына і дачкі. Назіраючы за паводзінамі таты, дачка потым зразумее, які ёй патрэбен мужчына побач. А калі мадэль няправільная, то сын можа пасля падпарадкоўвацца жонцы альбо ваша дачка будзе ўсё цягнуць у сям'і на сабе. Значыць, неабходна ставіць мужчыну ў галаву сям'і і ствараць яму ўмовы для працы і спакойнага знаходжання дома.

— За гады сямейнага жыцця вы склалі рэцэпт, як жанчыне аднаўляць сілы і энергію, калі штодня яна аддае іх сям'і, працы, блізкім?..

— Нельга паехаць на пляж, у СПА-салон і зарадзіцца. У мяне ёсць свае рытуалы, якія дапамагаюць расслабіцца. Да прыкладу, пасля складаных праектаў я раблю сабе «дзень белай столі», калі адключаю тэлефон і проста ляжу. Гэта дапамагае адпачыць цялесна, аднак не дае ўнутранага насычэння. А напаўняюць і вяртаюць твае эмацыянальныя затраты душэўныя моманты, калі зробленае табой атрымлівае водгук. Я люблю, калі дачка абдымае мяне за плечы. Тады такая цеплыня адразу разліваецца ўнутры, што хочацца рабіць яшчэ больш для сям'і. І муж неяк сказаў, што, калі чуе ад дачкі прызнанне ў любові, то адчувае нешта неверагоднае! Вельмі мала нам патрэбна, але такія моманты моцна на нас уздзейнічаюць. Нядаўна ездзілі да сына ў госці, і Герман павёў нас вячэраць. У рэстаране на сцяне я ўбачыла карціну — такую ж, як вісіць у нас дома. Ён, значыць, убачыў яе аднойчы і пасля захацеў менавіта туды нас адвесці. Мне грэла душу, што сын улічыў гэту дэталь. Вось такія сітуацыі і спрыяюць аднаўленню сіл. І я жадаю, каб у кожнай мамы былі такія моманты, якія дадуць ёй упэўненасць, што яе сям'я, дзеці ўсё разумеюць і цэняць.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва Анжаліны МІКУЛЬСКАЙ.

Поўную версію інтэрв'ю глядзіце на сайце zviazda.by.

Извещение о проведении 30 июня 2023 года повторного аукциона № 03-У-23 с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений)

Номер предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Краткая информация о расположенных на земельных участках капитальных строениях (зданиях, сооружениях), подлежащих сносу	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, бел. руб.
1	г. Минск, пересечение ул. Ваупшасова и ул. Солтыса	1,5300	Для строительства объекта «Объект торгово-бытового и коммунально-обслуживающего назначения на пересечении ул. Ваупшасова и ул. Солтыса в г. Минске»	15 883,03	83 692,91	16 700,00	Снос строений и сооружений, попадающих под пятно застройки, в том числе отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Таежной, 109, ул. Солтыса, 177, 179	1 061 855,70
2	г. Минск, ул. Виноградная	0,2648	Для строительства объекта «Объект торговли и бытового обслуживания по ул. Виноградной в г. Минске»	22 253,15	11 123,26	2 224,00	Снос объектов недвижимого имущества, попадающих под пятно застройки, в т. ч индивидуальных боксовых гаражей: ул. Сосновый Бор, 9А, пом. 12; ул. Сосновый Бор, 25А; ул. Сосновый Бор, 27; ул. Сосновый Бор, 27/1; ул. Сосновый Бор, 27/3; ул. Сосновый Бор, 27/4; ул. Сосновый Бор, 27/6; ул. Сосновый Бор, 27/8; ул. Сосновый Бор, 27/9; ул. Сосновый Бор, 27, пом. 10; ул. Сосновый Бор, 27/11; ул. Сосновый Бор, 27/12; ул. Сосновый Бор, 27/14; ул. Сосновый Бор, 27/15; ул. Сосновый Бор, 27/16	389 532,51
3	г. Минск в районе Степянка	1,2200	Для строительства объекта «Административно-деловой центр с многоуровневой гараж-стоянкой на 300 машино-мест в районе Степянка в г. Минске»	13 667,96	66 335,97	13 267,00	Снос объектов недвижимого имущества, попадающих под пятно застройки, в т. ч.: строения, здания и сооружения по ул. Карвата, 87 корп. 10, а также других объектов (ограждения, ворота, многолетние насаждения)	236 103,86

Организатор аукциона: государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемых земельных участках, на которых находятся объекты, подлежащие сносу.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет.

Аукцион состоится **30 июня 2023 г. в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7. Прием заявлений на участие в аукционе и прилагаемых к ним документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2 **с 16 июня 2023 г. по 26 июня 2023 г.** включительно в рабочие дни с 09.00. до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00). Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определен Положением «О порядке организации и проведения аукционов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений)», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13.01.2023 № 32. Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Порядок оформления участия в аукционе:

Для участия в аукционе индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок представляет организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (с отметкой банка). Задаток по соответствующему предмету аукциона перечисляется в срок, установленный для приема документов, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» в г. Минске, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 03-У-23 по предмету аукциона № __ (указать номер предмета аукциона);

подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 09.09.2013 № 43), включающее условие о задатке, обязательство по уплате штрафных санкций в соответствии с законодательством;

дополнительно представляется:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

